Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 ВЕРАСНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 189 (28299)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Як будуць правяраць ураджай каля БелАЭС?**

СТАР. 3



**Мінск «праглынуў» каля 200 вёсак…**

СТАР. 4



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Наталля КАЧАНАВА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Сацыяльная сфера ў рэспубліцы працуе дастаткова зладжана: няма праблем з выплатай пенсій, стыпендый, дапамог, рэалізуюцца намечаныя праграмы. Казаць пра тое, што ёсць сур'ёзныя правалы, не прыходзіцца. Сёння галоўная задача - удасканаленне выбудаванай структуры. Неабходна працаваць па двух канцэптуальна важных кірунках. Па-першае, дамагчыся эфектыўнай работы арганізацый ў сацыяльнай сферы. Ці гэта дашкольная ўстанова, ці бібліятэка, ці спартыўны аб'ект - кожная з іх павінна працаваць эфектыўна сама па сабе. Другім напрамкам з'яўляецца пазабюджэтная дзейнасць - найважнейшы ў сучасных умовах складнік работы сацыяльнай сферы. Гэта крыніца для паляпшэння як матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў, так і павышэння зарплаты работнікаў бюджэтнай сферы - настаўнікаў, работнікаў культуры, урачоў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.09.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9264 | ▼ |
| Еўра | 2,1610 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0304 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0743 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# АРХІТЭКТУРА ПАДТРЫМКІ І ЎЗАЕМНАЙ ВЫГАДЫ

**Беларусь і Кітай дасягнулі самых даверных адносін. Гэту фразу, сказаную Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам, можна лічыць ключавой у характарыстыцы дзяржаўнага візіту кіраўніка нашай краіны ў КНР.**



Фота СІНЬХУА–БЕЛТА.

Учора беларускі лідар сустрэўся са Старшынёй Пастаяннага камітэта Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў Чжан Дэцзянам, са Старшынёй Усекітайскага камітэта Народнага палітычнага кансультатыўнага савета Кітая Юй Чжэншэнам і правёў афіцыйныя перагаворы ў пашыраным складзе са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Сі Цзіньпіну за значны асабісты ўклад у развіццё беларуска-кітайскіх адносін: «Мы сапраўды сур'ёзна рушылі наперад у напрамку нашага супрацоўніцтва. Дазвольце мне ад імя беларускага народа і маёй дзяржавы падзякаваць вам асабіста за такі ўклад у нашы адносіны. Калі б не было гэтага асабістага ўкладу, не было б і такіх адносін».

«Пасля вашага візіту ў Беларусь у маі 2015 года мы вельмі інтэнсіўна працавалі над сумесным развіццём тых ініцыятыў, якія былі вамі выказаны, і, перш за ўсё, Эканамічнага пояса Шаўковага шляху, праекта Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка, які вы назвалі жамчужынай Шаўковага шляху. Гэта сапраўды важнейшы вузлавы элемент паглыблення рэгіянальнага і крэдытна-інвестыцыйнага супрацоўніцтва паміж нашымі дзяржавамі», — сказаў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, у мінулы перыяд актыўна ажыццяўляліся дзелавыя кантакты паміж дзвюма краінамі. Толькі з верасня 2015 года праведзена больш за чатыры дзясяткі візітаў у Кітай беларускіх дэлегацый на чале з кіраўнікамі органаў дзяржаўнага кіравання, рэгіёнаў і вялікіх кампаній. У сваю чаргу Беларусь наведалі многія дэлегацыі дзяржаўных і партыйных органаў КНР як цэнтральнага, так і рэгіянальнага ўзроўню, прадстаўнікоў бізнес-супольнасці Кітая.

Пасля завяршэння афіцыйных перагавораў у пашыраным фармаце кіраўнікі дзяржаў даволі працяглы час размаўлялі ў фармаце сам-насам. Як паведамляе БЕЛТА, на перагаворах абодвума бакамі адзначаўся беспрэцэдэнтна высокі ўзровень адносін, дасягнутых паміж Беларуссю і Кітаем. Тым не менш адзначана, што шмат яшчэ трэба будзе зрабіць.

Сярод іншых тэм Аляксандр Лукашэнка і Сі Цзіньпін абмеркавалі важнасць развіцця міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, патэнцыял якога неабходна больш актыўна выкарыстоўваць. Менавіта трывалыя рэгіянальныя сувязі садзейнічаюць умацаванню ўзаемаадносін паміж дзяржавамі. Размова на перагаворах таксама ішла аб узаемадзеянні ў гуманітарнай сферы і турызме. Адзначана неабходнасць зрабіць Шаўковы шлях дарогай з больш інтэнсіўным рухам, узмацняць узаемную падтрымку.

Старшыня КНР прапанаваў захаваць дынаміку адносін і сустрэч на вышэйшым і высокім узроўнях. «Мы вывелі двухбаковыя адносіны і шматпланавае супрацоўніцтва на траекторыю паскоранага развіцця. Ваш візіт праходзіць у вельмі важны момант, калі мы падводзім вынікі кітайска-беларускіх адносін. Кітай і Беларусь — сапраўдныя сябры і самыя шчырыя партнёры. Дзякуючы агульным намаганням кітайска-беларускія адносіны дынамічна развіваюцца і ўзнімаюцца на новы ўзровень, умацоўваюцца ўзаемадавер, практычнае супрацоўніцтва ва ўсіх галінах», — заявіў Сі Цзіньпін. «Вельмі рады бачыць, што дасягнутыя намі дамоўленасці эфектыўна рэалізуюцца. Мы гатовы разам з вамі займацца адзіным планаваннем далейшага развіцця двухбаковых адносін, каб надаць ім новы імпульс на карысць нашых народаў», — падкрэсліў Старшыня КНР. Сі Цзіньпін таксама адзначыў асабісты ўклад Прэзідэнта Беларусі ў развіццё двухбаковага супрацоўніцтва.

Па выніках афіцыйных перагавораў у Пекіне кіраўнікі дзяржаў падпісалі сумесную дэкларацыю Беларусі і КНР аб устанаўленні адносін даверната ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. У дакуменце падкрэсліваецца, што палітычны ўзаемадавер служыць краевугольным каменем беларуска-кітайскіх адносін. Заяўлена аб павазе і падтрымцы шляхоў развіцця ўнутранай і знешняй палітыкі кожнага з бакоў, а таксама суверэнітэту, незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці.

СТАР. 2

# Сакавіты цягнік



Фота БЕЛТА.

**Студэнты Беларускага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага ўніверсітэта дапамагаюць агракамбінату «Ждановічы» збіраць ураджай.**

# АРХІТЭКТУРА ПАДТРЫМКІ І ЎЗАЕМНАЙ ВЫГАДЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Беларусь зацвердзіла прыхільнасць да прынцыпу «аднаго Кітая». А кітайскі бок падтрымаў намаганні Беларусі, нацэленыя на забеспячэнне сацыяльна-палітычнай стабільнасці і эканамічнага развіцця, выступіў супраць знешняга ўмяшання ва ўнутраныя справы Беларусі пад любой маркай і заявіў аб прызнанні важнай ролі беларускага боку ва ўмацаванні рэгіянальнай бяспекі і стабільнасці.

У дэкларацыі замацаваны намер Беларусі прыступіць да ўдзелу ў стварэнні Інфармацыйнага пояса Шаўковага шляху, што дасць магчымасць забяспечыць адзіны падыход да ўзаемадзеяння з КНР, беручы пад увагу агульнасусветную тэндэнцыю да глабалізацыі інфармацыйнай прасторы.

Беларусь і Кітай заявілі ў дэкларацыі пра намер сумесна прасоўваць будаўніцтва «Аднаго пояса, аднаго шляху», умацоўваць спалучэнне гэтай ініцыятывы са стратэгіяй развіцця Беларусі, паглыбляць двухбаковае супрацоўніцтва ў інфраструктурнай, транспартна-лагістычнай, інфармацыйна-тэлекамунікацыйнай і іншых практычных галінах, сумесна забяспечваць бяспечную і паспяховую рэалізацыю агульных праектаў у інтарэсах далейшага павышэння ўзроўню ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

У эканамічным супрацоўніцтве нашы краіны маюць намер фарміраваць архітэктуру ўзаемнай выгады. «Бакі адзіныя ў тым, што гандлёва-эканамічнае, інвестыцыйнае і фінансавае супрацоўніцтва ўяўляе сабой рухаючую сілу беларуска-кітайскіх адносін. Бакі прымуць узгодненыя меры па фарміраванні архітэктуры ўзаемнай выгады і сумеснага выйгрышу, што характарызуецца шматпланавым, шырокамаштабным і шматузроўневым супрацоўніцтвам, паслядоўным напаўненнем матэрыяльнай базы беларуска-кітайскага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства», — адзначаецца ў дакуменце.

У дэкларацыі заяўлена таксама аб зацікаўленасці ў актывізацыі разлікаў у нацыянальных валютах у двухбаковым гандлі і інвестыцыйным супрацоўніцтве.

У цэлым у дакуменце адлюстраваны намеры развіцця беларуска-кітайскае супрацоўніцтва па самым шырокім спектры напрамкаў — ад адукацыі і турызму да міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння, лагістыкі і авіязносін. Асобнае адлюстраванне ў дакуменце знайшлі палажэнні аб сумесным процістаянні розным відам злачыннасці, узаемадзеянні ў галіне папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый.

Акрамя таго, у прысутнасці лідараў дзвюх краін былі падпісаны пакет пагадненняў і мемарандумаў аб развіцці супрацоўніцтва ў розных сферах. У прыватнасці, падпісана міжурадавае пагадненне аб тэхніка-эканамічнай дапамозе і мемарандум паміж Мінэканомікі Беларусі і Міністэрствам камерцыі КНР аб супрацоўніцтве ў мэтах развіцця Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка ў рамках тэхніка-эканамічнай дапамогі. Зацверджаны комплекс мер па сумесным развіцці будаўніцтва канцэпцыі «Адзін пояс, адзін шлях» паміж урадамі Беларусі і КНР. Заключаны мемарандум аб супрацоўніцтве паміж міністэрствамі адукацыі дзвюх краін у галіне сумеснай падрыхтоўкі кадраў, а таксама мемарандум аб узаемаразуменні паміж Беларусбанкам, Міністэрствам фінансаў Беларусі і Дзяржаўным банкам развіцця Кітая аб прадастаўленні крэдыту пад гарантыю ўрада Беларусі і шэраг іншых важных дакументаў.

Пасля афіцыйных перагавораў лідараў дзвюх краін Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў Сі Цзіньпіна ордэнам «За ўмацаванне міру і дружбы». Старшыня КНР удастоены гэтай узнагароды за вялікі асабісты ўклад у развіццё гандлёва-эканамічных, навукова-тэхнічных, гуманітарных сувязяў паміж Беларуссю і Кітаем, выключныя заслугі ва ўмацаванні дружалюбных адносін і супрацоўніцтва паміж дзяржавамі.

Гэта ўзнагарода з'яўляецца новай і ўручаецца ўпершыню.

Сёння візіт Прэзідэнта Беларусі ў Кітай завяршаецца. Запланавана сустрэча з Прэм'ерам Дзяржаўнага савета КНР Лі Кэцянь. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка наведае Пекінскі ўніверсітэт, дзе сустрэнецца з кіраўніцтвам ВНУ, студэнтамі, адкажа на іх пытанні.

## Субота — дзень прамых зваротаў

**Па традыцыі Мінгарвыканкам і аблвыканкамы праводзяць прамыя тэлефонныя лініі. У суботу, 1 кастрычніка, з 9.00 да 12.00 на прамой сувязі з жыхарамі ўсіх рэгіёнаў краіны будуць прадстаўнікі ўлады:**

намеснік старшыні **Брэсцкага аблвыканкама КЛЕЦ Андрэй Анатолевіч**. Тэл. (8016) 2213121;

кіраўнік спраў **Віцебскага аблвыканкама СЫСОЕЎ Аляксандр Уладзіміравіч**. Тэл. (8021) 2222222;

намеснік старшыні **Гомельскага аблвыканкама ГАРБАЧОЎ Уладзімір Уладзіміравіч**. Тэл. (8023) 2751237;

першы намеснік старшыні **Гродзенскага аблвыканкама ЖУК Іван Алейзавіч**. Тэл. (8015) 2735644;

намеснік старшыні **Магілёўскага аблвыканкама МАЛАШКА Валерый Анатолевіч**. Тэл. (8022) 2501869;

кіраўнік спраў **Мінскага аблвыканкама МАРКЕВІЧ Іван Станіслававіч**. Тэл. (8017) 5004160;

кіраўнік спраў **Мінскага гарвыканкама КОТАЎ Мікалай Аляксандравіч**. Тэл. (8017) 2224444.

**Да ведама членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

3 кастрычніка (10.00), 6 кастрычніка (14.00) і 7 кастрычніка (16.00) 2016 г. у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудуцца пасяджэнні дванаццатай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

**Да ведама дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

Першая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання пачне сваю работу 11 кастрычніка 2016 года ў 11 гадзін у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 11 кастрычніка 2016 года з 10.00 да 10.50 у фае залы пасяджэнняў.

■ Выбары-2016

# СКАРГІ НЕ ЗАДАВОЛІЛІ

### Адпаведнае рашэнне прыняла Цэнтральная камісія

**Учора Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў разгледзела скаргі кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў на выніки выбараў. Парадак аспрэчвання вынікаў дастаткова строгі: тры дні даецца пасля выбараў на падачу скаргі ў акруговую камісію; калі выніки разгляду кандыдата не задаволілі, ён можа падаць скаргу ў тэрытарыяльную камісію; калі і там разгляд яго не задаволіў, то ў трохдзённы тэрмін пасля яго скаргу можна падаць у апошнюю інстанцыю — у Цэнтральную камісію. Сёлета туды «дабраліся» дзве скаргі, і абедзве Цэнтрвыбаркам не задаволіў.**

**Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў**, паведаміла: галоўнай памылкай у абодвух заяўнікаў стала меркаванне пра тое, што можна па асобным участку прызнаць, што выбары не адбыліся. Гэта немагчыма ў прынцыпе, бо падвядзенне вынікаў ажыццяўляецца па ўсёй выбарчай акрузе — паколькі дэпутат абіраецца ад акругі ў цэлым, а не па адным участку.

Традыцыйна пасля пасяджэння Лідзія Міхайлаўна адказала на пытанні журналістаў.

### ...пра змены ў Выбарчы кодэкс

Пра гэта, па словах старшыні ЦВК, казаць яшчэ рана.

— Па-першае, у нас няма канчатковай справаздачы АБСЕ — гэта самае галоўнае, — патлумачыла яна. — Па-другое, пакуль Цэнтральнай камісіі проста няма калі: прайшло толькі два тыдні з дня выбараў. Плюс да ўсяго — Цэнтральная камісія ўжо пачала разгляд пытання аб ратацыі — змене складу. Ужо падбіраюцца кадры, і тое, каго мы падбяром, таксама мае вельмі вялікае значэнне. Па-трэцяе, у нас павінен запрацаваць парламент. Зараз мы разам з сакратарыятамі палат заняты падрыхтоўкай арганізацыйных сесій, якія адбудуцца 11 і 12 кастрычніка. Пакуль яшчэ ў нас не было магчымасці прыступіць да работы па змяненні заканадаўства.

### ...пра адказнасць членаў камісіі

Нядаўна з'явілася навіна, што ў Рэспубліцы Марый-Эл (Расійская Федэрацыя) адзін з членаў выбаркама пабіўся проста падчас работы камісіі з судовым прыставам. Журналісты пацікавіліся ў старшыні ЦВК, што трэба зрабіць, каб не ператвараць работу камісіі ў балаган.

— Грамадскія інстытуты не павінны вельмі моцна заарганізоўвацца, — лічыць Лідзія Ярмошына. — Чым больш нормаў, якія рэгулююць працэс або абмяжоўваюць яго, тым больш складаны для разумення выбарчы закон. Таму я лічу, што тых мер, якія дзейнічаюць у нас у краіне, дастаткова. Чаму ў нас не бывае боек? А ўсё вельмі проста: у нас выбарчыя камісіі фарміруюцца з салідных грамадзян. Калі ж мы пойдзем на повадзе ў нашых палітычных партый і станем уключаць у склад камісіі палітычных хуліганаў, у нас таксама пачнуцца бойкі. А зараз у нас людзі, якія адказваюць перад сваімі працоўнымі калектывамі, перад той грамадскасцю, якая іх вылучыла, і нясуць пэўную маральную адказнасць. Менавіта гэта і вызначае спакойную атмасферу на пасяджэннях камісіі.

### ...пра гендарны складнік новага склікання

— Жанчыны не ідуць на выбары, калі не маюць выразных цвёрдых гарантый, што ім на гэтых выбарах будуць дапамагаць і ў іх таму ёсць шанцы, — адзначыла старшыня Цэнтрвыбаркама. — Яны менш авантурныя, чым мужчыны. Таму трацына жанчын-дэпутатаў у любым выбарчым органе забяспечвае стабільнасць гэтага органа. Стабільнасць у добрым сэнсе — кансерватызм, агляду на выбаршчыкаў, на грамадскую думку...

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■

■ Партнёры

# Па веды — да нас

### Студэнты з Туркменістана прыязджаюць у Мінск дзеля якаснай адукацыі

**Такое меркаванне выказаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Туркменістана ў Рэспубліцы Беларусь Назаркулы ШАКУЛЫЕЎ. «Беларусь — дружалюбная нам дзяржава. Тут рыхтуюць спецыялістаў на высокім узроўні, таму нашы студэнты імкнуцца вучыцца ў Беларусі», — адзначыў дыпламат.**

Цяпер у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь навучаюцца 18 студэнтаў з гэтай краіны. Там прайшло ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае 25-годдзю незалежнасці Туркменістана, якое будзе адзначацца ў канцы кастрычніка. **Рэктар ВНУ Марат ЖЫЛІНСКІ** павіншаваў туркменскі бок з надыходзячым святам. «Незалежнасць і нацыянальнае адзінства стварылі спрыяльныя ўмовы для развіцця палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця. Далі туркменскаму народу магчымасць праявіць лепшыя рысы нацыянальнага характару», — адзначыў кіраўнік Акадэміі кіравання.

Гэты год па ініцыятыве Прэзідэнта Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедава праходзіць пад дэвізам «Год шанавання спадчыны, пераўтварэння Айчыны». Старажытная туркменская зямля вядома ва ўсім свеце дзякуючы сваім культурным і гістарычным помнікам. Гэта пацвярджае і аб'яўленне горада Дашагуз культурнай сталіцай Садружнасці Незалежных Дзяржаў у 2016 годзе.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

■

■ Інвестыцыйны клімат

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПРЫВАБНАСЦЬ НАВЕЙШАГА «ГАТУНКУ»

**У Беларусі сфарміравана сучасная заканадаўчая база для прыцягнення замежных інвестыцый. Больш таго, цяпер наша краіна паслядоўна пераходзіць на новы ўзровень узаемадзеяння з міжнароднымі фінансавымі інстытутамі, заявіў учора прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ на адкрыцці форуму «Пашыраючы гарызонты: інвестыцыі, фінансы, развіццё».**

Прэм'ер-міністр адзначыў, што сумеснымі намаганнямі мы выпрацоўваем і рэалізуем меры структурнай палітыкі ў эканоміцы і фінансах. Потым яны выкарыстоўваюцца пры падрыхтоўцы праграмных дакументаў краіны на бліжэйшую і сярэднетэрміновую перспектыву.

Паводле яго слоў, у аналагічным ключы маркуецца праводзіць дыялог і з бізнес-супольнасцю. «Сёння значная частка тэрыторыі краіны ўяўляе сабой дзеючыя прэферэнцыйныя рэжымы для размяшчэння бізнесу ў межах свабодных эканамічных зон, Парка высокіх тэхналогій, індустрыяльнага парка «Вялікі камень», — нагадаў кіраўнік урада. Цяпер Беларусі неабходна забяспечыць якасны і аператыўны пераход ад прыцягнення замежных крэдытных рэсурсаў да паўнавартаснага прытоку прамых замежных інвестыцый у розныя сферы нацыянальнай эканомікі. «Для гэтага нам трэба ў большай ступені арыентавацца на інвестыцыйную палітыку на канкрэтных інвестараў, добра ўяўляць сабе іх чаканні і магчымыя асцярогі», — адзначыў Андрэй Кабякоў. Ён лічыць, што адна з дзейсных формаў атрымання неабходнай для прыняцця рашэнняў інфармацыі — гэта дыялог з дзелавой супольнасцю. «Наш форум з'яўляецца яркім прыкладам такога дыялогу», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Даволі хутка ў нашай краіне будзе падрыхтавана дарожная карта па паляпшэнні інвестыцыйнага клімату, паведаміла ў сваю чаргу **дырэктар Нацыянальнага агенцтва інвестыцый і прыватызацыі Наталля НІКАНДРАВА**. У яе будуць уключаны прапановы, прадстаўленыя ў тым ліку і на форуме, які праходзіць у Мінску.

«Гэты дакумент можа выкарыстоўвацца ўрадам для карэкціроўкі эканамічнай палітыкі па шэрагу кірункаў», — патлумачыла Наталля Нікандрава. Чакаецца, што ў дарожнай карце будуць прадстаўлены прапановы прыватнага бізнесу, замежных інвестараў па стварэнні дадатковых спрыяльных умоў для прыцягнення і асваення інвестыцый, а таксама па пераадоленні існуючых бар'ераў у інвестыцыйнай дзейнасці.

**Кіраўнік аддзела Генеральнага дырэктарата па суседстве і перамовах аб пашырэнні Еўрапейскай камісіі Васіліс МАГАРАС** у сваім выступленні на форуме сказаў, што Еўрасаюз вітае тыя меры, якія прымаюцца ўрадам Беларусі для паляпшэння інвестклімату.

«Еўрасаюз гатовы аказаць садзейнічанне Беларусі па прыцягненні інвестыцый», — падкрэсліў Васіліс Магарас. Але, паводле яго слоў, ЕС важна пры гэтым разумець, што Беларусь гатовая зрабіць у сферы далейшага правядзення рэформаў, фарміравання спрыяльных для прыцягнення інвестыцый умоў, умацавання сваёй рэпутацыі.

«Самыя галоўныя перавагі Беларусі — гэта высокая адукаванасць насельніцтва, кваліфікаваная рабочая сіла, канкурэнтаздольная прадукцыя, дынамічны IT-сектар, багатыя традыцыі ў машынабудаванні і перапрацоўчай прамысловасці. А рэформы, праведзеныя ўрадам Беларусі, дапамаглі палепшыць сітуацыю ў прыватным сектары», — падкрэсліў прадстаўнік Еўракамісіі. Сёння ўсё больш увагі Беларусь надае развіццю малых і сярэдніх прадпрыемстваў. Гэта таксама станоўчы сігнал, дадаў ён.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■

■ Пад кантролем

# ЦІ БУДЗЕ БЯСПЕЧНЫМ УРАДЖАЙ КАЛЯ БелАЭС?

## Інфармаванасць грамадскасці — залог правільных высноў

**У БЕЛТА прайшла анлайн-канферэнцыя, прысвечаная асаблівасцям маніторынгу радыяцыйнай абстаноўкі ў раёне Беларускай атамнай электрастанцыі, якая будуецца. На шматлікія пытанні грамадзян і карэспандэнтаў агенцтва адказвала начальнік Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Марыя ГЕРМЯНЧУК. Прапануем увазе чытачоў найбольш актуальныя, на наш погляд, моманты гутаркі.**



***— Якія дадатковыя рэсурсы патрэбны для стварэння і эксплуатацыі сістэмы кантролю радыяцыйнай абстаноўкі ў зоне БелАЭС?***

— Мы ў Гідрамеце выкарыстоўваем увесь патэнцыял, які напрацаваны падчас чарнобыльскага і постчарнобыльскага перыяду. З дадатковых мерапрыемстваў неабходныя пастаяннае абнаўленне прыборнай базы (напрыклад, стварэнне рэзерву датчыкаў для замены тых, якія выходзяць са строю), падтрыманне сістэмы кантролю якасці, што патрабуе значных фінансавых рэсурсаў, але гэтыя выдаткі сябе апраўдваюць. Таксама неабходна пастаяннае навучанне персаналу. Мы праводзім трэнінгі, актыўна ўзаемадзейнічаем з БДУ ў галіне падрыхтоўкі спецыялістаў па радыяцыйнай бяспецы. Мы вельмі ўважліва ставімся да іх навучання, да стажыровак, заўсёды гатовы іх прыняць у Гідрамеце, каб яны прайшлі практыку, пісалі курсавыя, дыпломныя работы.

Пастаянна трэба мадэрнізаваць вылічальнае абсталяванне, таму што тэрмін яго жыцця тры — максімум пяць гадоў, потым яго трэба мяняць, устанаўліваць новае праграмнае забеспячэнне і г. д. Таму вельмі запатрабаваныя спецыялісты ў галіне IT-тэхналогій.

Што тычыцца лабараторый, то дадатковых вялікіх мы будаваць дакладна не будзем, а перасоўныя лабараторыі патрэбны. У нас у Гідрамеце ёсць дзве перасоўныя лабараторыі, але мы павінны абнаўляць абсталяванне, мадэрнізаваць іх. У прынцыпе, у краіне дастаткова лабараторый, каб забяспечыць тыя патрэбы, якія ўзнікаюць пры будаўніцтве АЭС. Калі спатрэбяцца дадатковыя лабараторыі, то мы іх пабудуем, але пакуль спраўляемся тымі сіламі, якія ў нас ёсць.

***— Многіх цікавіць, наколькі бяспечнымі будуць прадукты харчавання, якія вырошчваюцца паблізу БелАЭС. Ці будуць іх спецыяльна правяраць пасля запуску станцыі?***

— Цяпер прадукты харчавання, іх так званы фонавы стан, правераны. Праверку прайшлі бульба, ліставая гароднiна, малако, мяса — усе гэтыя звесткі ёсць. Калі пачне працаваць БелАЭС, то Мінсельгасхарч будзе кантраляваць (у іх для гэтага ёсць спецыяльныя лабараторыі) якасць прадуктаў харчавання ў месцы размяшчэння АЭС. Да гэтага, хутчэй за ўсё, яшчэ далучыцца Інстытут радыялогіі НАН Беларусі. У тым, што такі кантроль будзе абавязкова, можна не сумнявацца. Гэта адзін з элементаў забеспячэння сістэмы радыяцыйнай бяспекі. Пры штатнай рабоце АЭС прадукты харчавання будуць бяспечныя, гэта без сумневу. Таму што адмыслова праводзіліся разлікі і даследаванні, каб разумець, як работа станцыі можа паўплываць на забруджванне прадуктаў харчавання і ці паўплывае наогул. Я думаю, што сістэма радыяцыйнага кантролю харчавання будзе цалкам закрываць гэтыя пытанні.

***— Як плануецца інфармаваць насельніцтва аб стане навакольнага асяроддзя ў раёне назірання АЭС?***

— Калі правільна інфармаваць грамадскасць аб стане навакольнага асяроддзя, даваць поўную інфармацыю, то здаровы сэнс дазволіць грамадскасці рабіць правільныя высновы. Інфармаваць плануецца любым спосабам: праз СМІ, інфармацыйныя табло, праз работу са школьнікамі і студэнтамі, урачамі і педагогамі. Таму што ўрач і педагог, асабліва ў сельскай мясцовасці, яго слова, аўтарытэт маюць вельмі вялікае значэнне. Школьнікі, студэнты — людзі, якія маюць доступ да тых электронных СМІ, якія цяпер найбольш актыўна выкарыстоўваюцца ў распаўсюджванні інфармацыі. Нядаўнія даследаванні сведчаць пра тое, што ў Беларусі практычна 98 працэнтаў жыхароў маюць доступ да электронных сродкаў інфармацыі. Таму, калі мы вылучаем такія інфармацыйныя групы і працуем з імі, мы разумеем, што даём інфармацыю не толькі студэнту, школьніку, але ён яшчэ давядзе гэта і да ведама бацькоў, бабуль, дзядуляў.

***— Ці могуць умовы надвор'я якім-небудзь чынам паўплываць на работу Беларускай АЭС?***

— Умовы надвор'я — не. Кліматычныя ўмовы — таксама не (на саму работу станцыі). Але я разумею, адкуль, што называецца, гэтае пытанне ўзнікае. Калі падбіралі месца для будаўніцтва АЭС, прааналізавалі вялікую колькасць пляцовак, у тым ліку на наяўнасць так званых забаранляльных фактараў. Забаранляльныя фактары — гэта катастрафічныя паводкі, моцныя ўраганныя вятры, вялікія снегапады, высокія і нізкія тэмпературы. Што тычыцца Астравецкага раёна, то ўсе гэтыя фактары былі прааналізаваны, і я хачу сказаць, што ні адзін з іх не быў лімітуючым пры выбары пляцоўкі. Шматгадовыя назіранні за гідралагічным рэжымам, тэмпературай, хуткасцю ветру, вышынёй снежнага покрыва — усё гэта было прааналізавана. Мы нават праліčвалі так званы фактар метэаралагічнай уразлівасці, калі не проста сярэднія шматгадовыя звесткі ацэньваліся, а браліся максімальныя, самыя неспрыяльныя сітуацыі, якія толькі могуць быць. І сапраўды ў гэтым рэгіёне з такога пункту гледжання абмежаванняў для будаўніцтва АЭС не існуе. Але тым не менш мы арганізавалі і праводзім як метэаралагічны, так і гідралагічны маніторынг у раёне будаўніцтва БелАЭС. Што тычыцца гідралагічнага маніторынгу, то мы ўстанавілі ў Міхалішках аўтаматызаваны гідраметэаралагічны пост. Там мы ўвесь час праводзім у аўтаматызаваным рэжыме вымярэнні ўзроўню вады і тэмпературы, гэта дасць нам магчымасць ацэньваць уздзеянне АЭС на Вілію з пункту гледжання тэмпературнага рэжыму — тое, пра што непакоіцца літоўскі бок. Факты такія, што на аснове вынікаў аўтаматызаванага вымярэння ў нас ужо цяпер ёсць магчымасць казаць мовай лічбаў у гэтай сітуацыі. У будучыні з літоўскімі калегамі мы будзем мець магчымасць абменьвацца інфармацыяй, вынікамі вымярэнняў.

**Падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■

■ Надвор'е

# БАБІНА ЛЕТА Ў КВАДРАЦЕ

## У нядзелю — месцамі да плюс 25 градусаў

**Кароткачасовыя дажджы і пацяпленне чакаецца ў Беларусі ў выхадныя, паведамляе галоўны сіноптык службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**



Сапраўды грыбное надвор'е прагназуецца ў нас на выхадныя, калі на тэрыторыю краіны працягне паступаць цёплае і вільготнае паветра з Заходняй Еўропы. У суботу і нядзелю месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ў межах плюс 8—14 градусаў, удзень складзе ад 16 да 23 цяпла, а месцамі па Гомельскай і Брэсцкай абласцях — да плюс 25 градусаў.

Аднак, паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, пацяпленне будзе непрацяглым, бо на наступным тыдні зноў пахаладае. З першых дзён тыдня тэрыторыя Беларусі апынецца пад уплывам актыўных атмасферных франтоў, якія выцісне цяпло за межы краіны. У панядзелак і аўторак на большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ў трэці дзень кастрычніка складзе ад 8 да 14 цяпла ўначы, удзень — ад плюс 14 да плюс 19 градусаў, а па паўднёвым усходзе краіны паветра паспее прагрэцца яшчэ да 20—23 цяпла. А вось у аўторак стане халадней, калі тэмпература паветра ўначы панізіцца да 5—12 цяпла, а ўдзень складзе ад плюс 10 да плюс 17 градусаў. Атрымліваецца, што на наступным тыдні мы будзем вымушаны яшчэ памерзнуць пры халодных батарэях. Нагадаю, што ў жыллёвым сектары іх «запускаюць», калі сярэднясутачная тэмпература паветра будзе ніжэй за плюс 8 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■


**Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»**

**сообщает о внесении изменения в извещение о проведении 17 октября 2016 года открытого аукциона с условиями № 10-У-16 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) (опубликовано в газете «Звязда» от 16.09.2015): в графе 7 таблицы извещения цифры «9 104,69/91 046 900» заменяются цифрами «12 691,22/126 912 200».**

Телефон для справок 226-16-72.

УНП 190398583

**31 октября 2016 г. в 15.00**

**по адресу: г. Молодечно, ул. Элеваторная, 1 состоится внеочередное общее собрание акционеров**

**ОАО «Молодечненский завод железобетонных изделий»**

**Повестка дня:** утверждение новой редакции устава ОАО «Молодечненский завод железобетонных изделий» в связи с изменением законодательства, в соответствии с которым требуется внесение изменений и(или) дополнений в устав.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться с 14 октября 2016 года по 31 октября 2016 года до 12.00 по месту проведения собрания.

Регистрация участников 31 октября 2016 г. с 14.30 до 15.00 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 600136965

Утерянную печать Иностранного частного торгового унитарного предприятия «Надер и Эбрагим компани» УНП 191432837 **считать недействительной.**

ПЕРЕГОВОРЫ ПО ВЫБОРУ ПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ

**УП «Проектный институт Белгипрозем» ПРИГЛАШАЕТ ВАС ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ по выбору подрядной организации для проведения следующих видов работ:**

**Лот № 1** – предмет закупки – разработка проектно-сметной документации по модернизации здания склада, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 86Б/1, и гаража, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 86Б, согласно актам обследования № 2 от 29.07.2016 г.

**Лот № 2** – разработка проектно-сметной документации и монтаж пожарной сигнализации в здании склада, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 86Б/1, и гаража, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 86Б, согласно актам обследования № 3 от 29.07.2016 г.

**Лот № 3** – предмет закупки – разработка проектно-сметной документации по текущему ремонту (электропроводки) помещений, расположенных в здании по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 26, согласно дефектному акту.

Примерный перечень видов строительных работ (акты обследования и дефектный акт) можно получить у специалистов предприятия:

- Бейсова Г.Б. – тел. 207 05 33;
- Лукашевич А.Ф. – тел. 207 05 33.

Переговоры будут проведены без предварительного квалифицированного отбора.

Срок выполнения работ – октябрь 2016 г.

Оплата ежемесячно – по факту выполнения работ.

Затраты, связанные с командировочными расходами или разъездным характером работ, не возмещаются.

Время проведения переговоров – 6 октября в 11.00.

Информация о переговорах и заявка на участие по тел.: 207 05 33, 212 07 00.

УНП 100035563


**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае глыбокае спачуванне супрацоўніцы часопіса «Нёман» Наталлі Міхайлаўне Казапалянскай у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

■ Сацыяльны клопат

# СТРЫЖКА, МУЗЕІ І КІНО

## У магілёўскіх пенсіянераў ёсць магчымасць сэканоміць

**Сярод мерапрыемстваў, прысвечаных Дню пажылых людзей, льготныя стрыжкі ў цырульнях, наведванне выставак і дабрачынны прагляд кінафільмаў. Напрыклад, у магілёўскім салоне «Чараўніца» простая стрыжка абыдзецца грамадзянам ва ўзросце на 30% танней, чым звычайна, а ў такой жа ўстанове пад назвай «Апельсін» любая стрыжка будзе каштаваць усяго 5 рублёў.**

Праўда, перад тым, як ісці да майстра, трэба будзе папярэдне патэлефанаваць і запісацца на паслугу. На такім жа прынцыпе будуць працаваць на працягу трох дзён (з 29 верасня па 1 кастрычніка) і шэраг іншых магілёўскіх цырульняў. Зніжкі на іх паслугі складаюць ад 10 да 50%, некаторыя згодны рабіць прыгажосць наогул бясплатна. Першага кастрычніка магілёўскае прадпрыемства «Хімчыстка і мыццё бялізны» прапануе ўладальнікам пенсійных пасведчанняў зніжку 5% на ўсе паслугі. Гэтага ж дакумента будзе дастаткова, каб 1 і 2 кастрычніка бясплатна наведаць магілёўскія музеі і кінатэатры. Акрамя гэтага для пенсіянераў творчымі калектывамі Магілёва падрыхтаваны бясплатныя канцэрты, а ў Любужскім лесапарку арганізавана фізкультурна-аздараўленчае мерапрыемства «Сцежка здароўя».

Зніжкі і акцыі да Дня пажылых людзей рыхтуюць усе гандлёвыя аб'екты Магілёўшчыны. Пенсіянеры могуць набыць харчовыя і прамысловыя тавары таннеей на 3—30%. Сацыяльныя аб'екты Бабруйска і райцэнтраў таксама прадастаўляюць магчымасць сэканоміць. Напрыклад, у Асіповічах 1 кастрычніка памыць бялізну можна будзе таннеей на 10%. А Крычаўскае прадпрыемства «Бытпаслугі» абяцае ў гэты дзень стрыгчы пенсіянераў бясплатна.

— У вобласці сёння налічваецца больш за 270 тысяч чалавек непрацаздольнага ўзросту, — адзначае **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага аблвыканкама Вераніка ДЗЯМІДАВА.** — Гэта людзі, якія шмат сіл уклалі ў тое, чым мы зараз карыстаемся. Яны і сёння вядуць актыўны лад жыцця, удзельнічаюць у розных мерапрыемствах, падарожнічаюць, займаюцца спортам. Свята, якое адзначаецца 1 кастрычніка, — яшчэ адна спроба прыцягнуць увагу да гэтай катэгорыі насельніцтва і нагадаць аб тым, што гэтыя людзі для нас зрабілі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# Да сустрэч у «Рэтра-кіназале»

## На Міншчыне стартуе новы сацыяльны праект для пажылых

**1 кастрычніка, у Міжнародны дзень пажылых людзей, у Мікалаеўшчынскім доме-інтэрнаце для ветэранаў вайны, працы і інвалідаў Стаўбцоўскага раёна стартуе новы абласны сацыяльны праект «Рэтра-кіназала», арганізатарамі якога выступаюць Мінская абласная арганізацыя БРСМ сумесна з камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Мінскага абласнога выканаўчага камітэта і Мінскім абласным Саветам ветэранаў.**

«Рэтра-кіназала» — гэта новая форма работы з пажылымі людзьмі, якая дае магчымасць стасункаў, абмену думкамі маладога і старэйшага пакаленняў падчас прагляду кінастужкі. Сутнасць праекта заключаецца ў арганізацыі сумеснага прагляду вядомага айчыннага фільма, які змяшчае ў сабе грамадскія ідэі і носіць ідэалагічны характар, валанцёрамі БРСМ і тымі, хто пражывае ў сацыяльных установах. Прагляд кінастужкі будзе праходзіць за «круглым сталом» ва ўтульнай атмасферы за кубкам гарбаты.

Праграму дня дапоўняць прыемныя сюрпрызы — канцэрт для гасцей і ўдзельнікаў мерапрыемства, прысвечаны Дню пажылых людзей, выстаўка работ дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Вясковец», а таксама ўручэнне памятных сувеніраў, віншавальных паштовак і кветак віноўнікам урачыстасці.

Вынікам мерапрыемства стане сумесная працоўная акцыя па закладцы рабінавай алеі з устаноўкай памятнага каменя з гранітнай таблічкай з нагоды Міжнароднага дня пажылых людзей, якая завяршыцца запускам у неба гелівых шароў як знака шчырасці, чысціні і, у першую чаргу, увагі і клопату ў дачыненні да людзей сталага ўзросту.

Асноўнай мэтай праекта з'яўляецца задавальненне сацыяльных і культурных патрэб грамадзян сталага веку, прыцягненне ўвагі маладога пакалення да праблем людзей пажылога ўзросту, пошук новых формаў работы з імі і арганізацыя іх якаснага вольнага часу.

Падобныя мерапрыемствы ў рамках праекта «Рэтра-кіназала» пройдуць на тэрыторыі Мінскай вобласці таксама ў Лагойскім і Нясвіжскім дамах-інтэрнатах для састарэлых і інвалідаў, Старадарожскім доме-інтэрнаце для састарэлых.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■

■ Дарогамі гісторыі

# URBEM INSATIABILES — ГОРАД НЕНАСЫТНЫ

## Як Мінск «праглынае» вёскі

**Менш чым за паўтара стагоддзя ў склад цяперашняй сталіцы ўвайшло каля 200 невялікіх населеных пунктаў. Зялёны Луг, Лошыца, Серабранка, Шабаны, Сухарава — у кожнага сучаснага мінчука на слыху назвы гэтых, здавалася б, не такіх старых раёнаў горада. Але з'ездзіць у Лошыцу ці пагасцяваць у Шабанах можна было яшчэ ў другой палове XIX стагоддзя — гэта назвы тагачасных вёсак. Пастунова самі вёскі, хутары і засценкі зніклі, а тапонімы засталіся. Мы пастараліся разгледзець прасёлачныя дарогі пад тоўшчай асфальту.**




### Адна карта на 140 гадоў

Дарэчы, даведацца, што знаходзілася на месцы вашага дома або офіса, можна з дапамогай інтэрактыўнай анлайн-карты. Беларускія даследчыкі з дапамогай сучасных тэхналогій стварылі рэсурс, які аб'ядноўвае адразу 6 картаў розных перыядаў — 1874, 1915, 1933, 1964, 1984 і 2016 гадоў — у адну. Як расказаў адзін з аўтараў праекта **Аляксандр ЛАЧЫЎКА**, увасобіць ідэю ў жыццё было даволі складана. Паміж картамі ёсць істотныя адрозненні, некаторыя аб'екты «перамяшчаюцца ў прасторы» на некалькі соцень метраў. Аляксандр тлумачыць гэта рознымі ўяўленнямі аб форме Зямлі: калі ў XIX стагоддзі яна лічылася круглай, то пазней навукоўцы прыйшлі да высновы, што наша планета бліжэй да эліпсоіда. Пагрэшнасці ў пазнейшых варыянтах можна растлумачыць нізкай якасцю друку. Напрыклад, складальнікі той ж самай карты 1915 года, якія займаліся сваёй справай падчас Першай сусветнай вайны, з-за асаблівасцяў перыяду былі абмежаваныя ў сродках і магчымасцях. Лёгкае патуранне картографаў і неакуратнае выкананне — занадта тоўстыя лініі (дарогі атрымліваліся шырынёй 15—20 метраў) — таксама неспрыяльна ўплывалі на якасць.

Ключавыя кропкі, па якіх сумяшчаюцца карты, — гэта рэлігійныя збудаванні, могілкі і чыгунка. Вызначэнне месцазнаходжання храма часцей за ўсё вельмі дакладнае, бо крыж — умоўная адзнака — ставіцца звычайна менавіта там, дзе знаходзіцца алтарная частка. Калі ж на абраным участку няма ніякіх знакавых аб'ектаў, зваяраюцца перакрыжаванні прасёлкавых дарог.

Пасля асваення касмічнай прасторы дакладнасць картаў значна павысілася. Дакумент 1964 года ўжо ўяўляе сабой здымак з космасу. З 1963 па 1973 год у межах амерыканскіх разведвальных праграм «Карона» і «Лан'ярд» шпіёнскія спадарожнікі кружылі над планетай і фатаграфавалі гарады, асаблівую ўвагу надаючы, вядома, Савецкаму Саюзу. За гэты перыяд спадарожнік праляцеў над Мінскам каля 10 разоў і, адпаведна, вельмі падрабязна яго адлюстраваў. На выяве можна разгледзець не толькі манументы або будынкі, але нават і паркавыя дарожкі. Менавіта здымак 1964 года паказвае, як у сталіцы з'яўляліся першыя мікрараёны, новы тып забудовы — панэльныя дамы, кардынальна змянялася аблічча цяперашніх вуліц Розы Люксембург і Талбухіна, пачалося ўзвядзенне Чыжоўкі.

Для таго, каб рэалізаваць праект, яго стваральнікі старанна вывучылі ўсе карты, вызначылі месцазнаходжанне кожнай вёскі ў акрузе або ўжо ў складзе Мінска. Дарэчы, некаторыя варыянты картаў да гэтага часу засакрэчаныя. Уся работа заняла паўгода, аднак праект яшчэ нельга назваць завершаным. У найбліжэйшых планах даданне яшчэ трох картаў: дэталёвай карты Мінска 1929 года, на якой адзначаны не толькі назвы вёсак, але і месцазнаходжанне асобных дамоў; нямецкая карта 1944 года, якая стваралася на базе савецкіх картаў, аднак была ўдакладнена пры дапамозе ваеннай аэрафотаздымкі і карта 1996 года, якая ўтрымлівае ў тым ліку і звесткі аб вышынях.

### Захаваць нельга забыць

**Даследчык гісторыі горада Мінска, выкладчык БДЭУ Іван САЦУКЕВІЧ** адзначыў, што пераломным момантам у гісторыі Мінска сталі 1870-я гады. Менавіта тады праз горад была пракладзена спачатку Маскоўска-Брэсцкая, а пасля і Лібава-Роменская чыгунка. Пасля гэтага горад пачаў імкліва разрастацца. Калі ў канцы XVIII стагоддзя тэрыторыя Мінска складала ўсяго паўтара па паўтара кіламетра, то праз сто гадоў горад узбуйніўся ў 10 разоў: колькасць насельніцтва, напрыклад, з 9 тысяч чалавек павялічылася да 90 тысяч.

А што з вёскамі? Яны пачалі ўваходзіць у склад горада, аднак істотных змен не перажывалі. Сам Мінск у канцы XIX стагоддзя ўвесь быў пераважна драўляным і аднапавярховы, таму ніякага дысанансу не назіралася. Дарэчы, назва «вёска» не зусім дакладная. У сваім першапачатковым значэнні гэта слова азначала месца паселішча прыгонных сялян. І ў наваколлі Мінска іх было ўсяго 7. А вось засценкаў, слабод, хутароў, фальваркаў — безліч.

Значна скарацілася колькасць невялікіх населеных пунктаў у перыяд калектывізацыі. Іх у масавым парадку аб'ядноўвалі ў калгасы, некаторыя — узбуйнялі горад, які рос. Яшчэ адным велізарным выпрабаваннем сталі гады Вялікай Айчыннай вайны: не ўсім вёскам удалося ацалець, многія ніколі так і не былі адноўлены. Пасля вайны — гады актыўнага будаўніцтва. Большасць вёсак з ваколіц сталіцы да гэтага моманту засталася толькі на старых картах. Паспрабуем іх там адшукаць.

Знаходзім на карце 1874 года вёску Сухарава, дарэчы, першыя згадкі пра яе датуюцца яшчэ XVI(!) стагоддзем. У другой палове XIX стагоддзя невялікі населены пункт, на месцы цяперашняга мікрараёна Сухарава-7, складаўся з 13 двароў. А вось на карце 1933 года лічба ўжо зусім іншая — 86 двароў, але і сама вёска «перамясцілася» ў прастору паміж сучаснымі вуліцамі Калеўва і Семянякі. Гэта адна з вёсак-доўгажыхароў, яна была ўключана ў склад Мінска толькі ў 1992 годзе, а апошнія драўляныя дамкі тут наогул зніклі ўсяго некалькі гадоў таму. Непадалёку знаходзяцца могілкі, на тэрыторыі якіх удалося да цяперашняга моманту захаваць гістарычна значныя курганы. Дарэчы, гэта быў не адзіны населены пункт з такой назвай. У канцы XIX стагоддзя на месцы сучаснага мікрараёна Чырвоны Бор-2 быў засценак Сухарава, які складаўся ўсяго з аднаго двара.

Мы не задумваемся над гэтым, але велізарная колькасць месцаў у горадзе носіць назвы, якім ужо не адно стагоддзе. Так сваю гістарычную спадчыну спрабуюць захаваць былыя жыхары ўжо зніклай з твару зямлі вёскі Бараноўшчына. У канцы XIX стагоддзя пад гэтай назвай быў вядомы засценак, у сярэдзіне XX стагоддзя — невялікая вёска ў 28 двароў. Будаўніцтва буйной магістралі — вуліцы Прытыцкага — паставіла крыж на далейшым існаванні населенага пункта. Аднак тапонім усё ж удалося захаваць — так называецца вуліца і прыпынак транспарту. Аднак неабыякавым зараз ужо гараджанам гэтага здалося недастаткова: яны звярнуліся да ўладаў з прапановай усталяваць валун-помнік і інфармацыйны стэнд на месцы, дзе раней была вёска.

Дзякуючы ініцыятыўным жыхарам раёна ўдалося выратаваць і тапонім Брылевічы. У 1964 годзе краіну захліснула хваля масавых перайменаванняў населеных пунктаў. Так у абсалютна безабліччную Дружбу была перайменаваная вёска Рылоўшчына, якую мы бачым яшчэ на карце 1874 года. Недалёка ад яе, на другім баку ракі Лошыца (супрацьлеглая мікрараёну з такой назвай частка горада) знаходзілася сядзіба буйных князёў Брылеўскіх. Пасля таго, як на гэтай тэрыторыі пачалося ўзвядзенне новага мікрараёна, ён атрымаў усё ж замацаваную назву Дружба. Тыя, хто добра знаёмы з гісторыяй гэтага месца, былі абураныя. Бо такую назву можна сустрэць у любым горадзе на постсавецкай прасторы, яна практычна безінфармацыйная, бо нельга ж усур'ёз сцвярджаць, што жыхары гэтага мікрараёна вылучаюцца асаблівымі душэўнымі якасцямі. І гараджане настаялі на тым, каб хоць бы канчатковы прыпынак транспарту перайменавалі ў Брылевічы. Улады паставіліся з разуменнем, а далей спрацаваў усё ж такі прынцып тутэйшай «дружбы»: перадаючы ад аднаго да другога праўдзівую назву раёна, удалося дасягнуць мэты і замацаваць за ім тапонім Брылевічы.

Захаваць нельга забыць. Дык дзе ўсё ж такі ставім коску?

**Дар'я КАСКО.**
kasko@zviazda.by

■ Пасля пісьма

# «БЫЎ ТАКІ АЎТОБУС...»

**Пад такім загалоўкам 8 жніўня г.г. у газеце быў змешчаны ліст жыхароў вёскі Межная Слабада Клецкага раёна. У ім паведамлялася, што раней праз іх мясціны праходзіў вельмі зручны аўтобус Баранавічы — Гомель, Гомель — Баранавічы. Але ж летам маршрут закрылі...**

Як паведаміла ў адказ на гэтую публікацыю **намеснік міністра транспарту і камунікацый краіны Наталля ЖАМОЙЦІНА**, зварот чытачоў разгледжаны. Даслоўна: *«У адпаведнасці з артыкулам 12 Закона Рэспублікі Беларусь ад 14 жніўня 2007 года «Аб аўтамабільным транспарце і аўтамабільных перавозках» заказчыкамі гарадскіх, прыгарадных і міжгародніх унутрыабласных аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярным руху выступаюць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, якія арганізуюць аўтамабільныя перавозкі пасажыраў па тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі і забяспечваюць рэалізацыю нарматываў дзяржаўных сацыяльных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва рэспублікі ў галіне транспарту.*

*Арганізатарам міжгародніх міжабласных аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярным руху з'яўляецца Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь (далей — Мінтранс).*

*Мінтрансам было дадзена права на выкананне міжгародніх міжабласных аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярным руху па маршруце Баранавічы — Гомель (працягласць маршруту 421 км) перавозчыкам ААТ «Аўтобусны парк г. Баранавічы» і філіялу «Аўтобусны парк №1» ААТ «Гомельаблаўтатранс».*

*На працягу некалькіх апошніх гадоў з-за нізкага пасажырапатоку (асабліва ў асенне-зімовы перыяд) з мэтай зніжэння стратнасці работы на міжгародніх маршрутах у рэгулярным руху аўтамабільнымі перавозчыкамі прымаліся меры па аптымізацыі перавозак пасажыраў: змянялася перыядычнасць выканання рэйсаў, выкарыстоўваліся аўтобусы малой умяшчальнасці. Аднак станоўчага выніку гэтыя мерапрыемствы не прынеслі.*

*Акрамя таго, аналіз па маршруце Баранавічы — Гомель, які праводзіўся работнікамі ААТ «Аўтобусны парк г. Баранавічы» і філіяла «Аўтобусны парк № 1» ААТ «Гомельаблаўтатранс» паказаў, што гэты аўтобусны маршрут быў запатрабаваны толькі пасажырамі, якія ажыццяўляюць паездкі з г. Баранавічы да населеных пунктаў Мінскай вобласці і ў адваротным напрамку.*

*Таму, у сувязі з нізкім пасажырапатокам і стратнасцю перавозак аўтамабільным перавозчыкам ААТ «Аўтобусны парк г. Баранавічы» з чэрвеня 2014 г. было прынята рашэнне аб закрыцці дадзенага маршруту.*

*Філіял «Аўтобусны парк № 1» ААТ «Гомельаблаўтатранс» спыніў рух аўтобусаў па названым маршруце ў маі 2016 г. Пры гэтым неабходна адзначыць, што заканадаўствам не прадугледжана субсідаванне міжгародніх аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярным руху (у адрозненне ад гарадскіх і прыгарадных).*

*У цяперашні час па ўсіх днях тыдня грамадзяне маюць магчымасць здзейсніць паездку чыгуначным транспартам з г. Баранавічы ў напрамку г. Гомеля па маршрутах: Гродна — Гомель, Гродна — Мінск — Гомель, Баранавічы — Херсон.*

*Пры гэтым, як паказвае практыка, для паездак па рэспубліцы многія пасажыры аддаюць перавагу чыгуначнаму транспарту з прычыны больш нізкіх тарыфаў на гэты від перавозак.*

*Разам з тым нарматывы дзяржаўных сацыяльных стандартаў у галіне транспартнага абслугоўвання насельніцтва па рэспубліцы выконваюцца ў поўным аб'ёме ў адпаведнасці з пастановай Савета міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 мая 2003 года № 724 «Аб мерах па ўкараненні сістэмы дзяржаўных сацыяльных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва рэспублікі».*

*Адначасова інфармуем, што ў дадзеным артыкуле не пазначана, у які канкрэтна населены пункт жыхарам вёскі Межная Слабада Клецкага раёна неабходна ажыццяўляць паездкі.*

*Маршрутная сетка Рэспублікі Беларусь пабудавана з улікам транспартных сувязяў населеных пунктаў з раённымі цэнтрамі, якія ў сваю чаргу павінны быць звязаныя са сталіцай і абласнымі цэнтрамі (з мэтай вырашэння сацыяльных пытанняў насельніцтва ў перыяд работы ўстаноў, арганізацый горада).*

***Пытанні арганізацыі прыгарадных аўтамабільных перавозак пасажыраў знаходзяцца ў кампетэнцыі райвыканкамаў. Заказчыкам аўтамабільных перавозак пасажыраў у рэгулярным руху з'яўляецца Клецкі раённы выканаўчы камітэт, які прымае неабходныя меры па ўдасканаленні абслугоўвання пасажыраў гэтага рэгіёна ў адпаведнасці з наяўнай патрэбай.***

*У адрас Клецкага раённага выканаўчага камітэта накіравана пісьмо з просьбай прааналізаваць забяспечанасць перавозкамі ў рэгулярным руху жыхароў вёскі Межная Слабада, пры неабходнасці прыняць меры па ўдасканаленні абслугоўвання пасажыраў гэтага рэгіёна ў адпаведнасці з наяўнай патрэбай і пра вынікі разгляду ўказанага артыкула праінфармаваць рэдакцыю газеты «Звязда».*

Вось гэты адказ мы пакуль не атрымалі. А таму, што называецца, кропку не ставім...

TV@R

## Іван ЭЙСМАНТ:

# «Феерверку не будзе. Будзе ўдасканаленне»



**Па традыцыі ў верасні пачынаюць адлік чарговага года не толькі выкладчыкі, школьнікі і студэнты. У гэты ж час на тэлеканалах стартуе новы вяшчальны сезон, напоўнены разнастайнымі прэм'ерамі і сюрпрызамі для гледачоў. Нехта ўсё лета здымае новыя забаўляльныя праграмы, нехта набывае самыя свежыя і рэйтынгавыя серыялы або рэаліці-шоу, нехта робіць стаўку на новыя аўтарскія праекты са свежымі, не замыленымі на тэлеэкранах вядучымі. Чым парадуе сёлета, бадай, галоўны рухавік тэлеканала «Беларусь 1» — Агенцтва тэленавін, якое робіць амаль 40 розных праектаў і штогод прапануе аўдыторыі новыя цікавінкі? Гэта пытанне, а таксама пажаданні і заўвагі гледачоў «Звязда» адрасавала галоўнаму дырэктару АТН Івану ЭЙСМАНТУ.**

***— На пачатку сезона многія ўжо прадставілі навінкі эфіру, а вось АТН захоўвае маўчанне...***

— Ведаеце, апошнім часам у нас размыліся грані новага сезона — штосьці новае, цікавае мы стараемся прыдумваць пастаянна, не прымяркоўваючы гэта да канкрэтных дат. Напрыклад, летась з увядзеннем у эксплуатацыю ў вялікай «студыі 600» эксклюзіўнага святлодыёднага экрана было запушчана фактычна абноўленае тэлебачанне, звязанае з юбілеем беларускага ТБ. У новай «упакоўцы» выйшлі вядучыя праекты АТН — «Галоўны эфір», «Клуб рэдактараў». Ток-шоу «Форум» не толькі пачало выходзіць у новай студыі, але і набыло новы фармат, сам прынцып пабудовы перадачы. Таксама летась мы рэалізавалі праекты «Беларусь XXI», «Мы зрабілі гэта разам», «Мы — беларусы», «Зроблена ў Беларусі» — за, якія, дарэчы, ужо сёлета атрымалі каля дзясятка прафесійных узнагарод на «Тэлевяршыні». Усе згаданыя праекты расцягнуліся амаль да гэтага года, таму цяпер мы працуем не над запускам феерверку прэм'ер, а над тым, каб усе праграмы, якія стаяць у лінейцы, яшчэ больш удасканаліць, чымсьці аздобіць, знайсці незвычайныя хады, цікавыя для аўдыторыі. Аднак, безумоўна, будуць і навінкі.

## У гасцях у Фрунзэ

— Мы задумалі вельмі маштабны праект, прысвечаны 100-годдзю беларускай міліцыі, якое будзе адзначацца ў наступным годзе. Сумесна з Міністэрствам унутраных спраў здымаем 9-серыйны дакументальны фільм пра гісторыю беларускай міліцыі. Ідэя вельмі маштабная і даволі няпростая, бо трэба адлюстраваць перыяд ад 1917-га да 2017-га. А што мы можам сёння сказаць пра 1917 год? Хіба што знайсці архіўныя кадры з Леніным на браневіку. Таму робім упор на рэканструкцыю падзей — над гэтай задачай працуе вялікі аўтарскі калектыў, група рэжысёраў, падключана нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм», задзейнічаны вопытныя беларускія акцёры, грымёры... З дапамогай МУС мы дасталі міліцэйскую форму ўсіх часоў, якая толькі існавала, і стараемся не проста пераапрануць у яе сучаснікаў, а сапраўды пагрузіцца ў атмасферу таго часу. Днямі стартавалі першыя здымкі — для іх уначы была перакрыта вуліца Карла Маркса (там на скрыжаванні з вуліцай Леніна некалі размяшчаўся цэнтральны апарат беларускай міліцыі, якой кіраваў Міхаіл Фрунзэ; там жа быў прыняты загад №1 пра барацьбу з бандытызмам. — **Аўт.**).

***— У фільме, акрамя гістарычнага экскурсу, знойдзецца месца аператыўнай рабоце міліцыянераў, страляніне, затрыманням і пагоням?***

— Не без гэтага, — пагаджаецца Іван Міхайлавіч. — Далей будзе яшчэ адзін цікавы і складаны этап для рэканструкцыі — час Вялікай Айчыннай вайны з франтавымі дзеяннямі і пасляваенная барацьба з бандытамі. Так, этап за этапам, паступова дойдзем да нашых дзён і раскажам шырокаму колу гледачоў, што сабой уяўляе беларуская міліцыя сёння.

**«Мы ні ў якім выпадку не імкнёмся да таннай папулярнасці за кошт «чарнухі», інакш закупалі б бясконцыя дэтэктыўныя серыялы, як робяць некаторыя тэлеканалы».**

Першую, уводную, серыю пакажуць у лістападзе, а са студзеня 2017 года праект будзе выходзіць раз на тыдзень і фінішуе 4 сакавіка, у Дзень беларускай міліцыі.

«Тварам» і голасам фільма стане акцёр Яўген Нікіцін, які больш падрабязна будзе расказваць гледачам пра тыя ці іншыя гістарычныя факты і падзеі.

## Навіны пра навіны

Паводле слоў Івана Эйсманта, ніводны з дзейсных праектаў АТН не пакіне эфір. Так, па-ранейшаму абмяркоўваюць самыя гарачыя тэмы тыдня ўдзельнікі «Клуба рэдактараў» (праграма змяніла «ўпакоўку» і перасунулася з вечара нядзелі ў ранішні эфір — у тым ліку па просьбах гледачоў, якія жыва рэагуюць на эфіры. І не дзіва: «Клуб рэдактараў» — адна з нямногіх дыскусійных пляцовак беларускіх СМІ, дзе абмяркоўваецца самыя злабадзённыя тэмы. У аўтарскай праграме «Буйным планам з Маратам Маркавым», якая з верасня выходзіць па чацвяргах, гледачоў па-ранейшаму чакаюць сустрэчы з цікавымі людзьмі — непасрэднымі ўдзельнікамі галоўных падзей у Беларусі і па-за яе межамі. Інфармацыйна-аналітычная праграма «Галоўны эфір», якая нядаўна атрымала прэстыжную ўзнагароду міжнароднага фестывалю «Тэфі-Садружнасць-2016», шукае новыя падыходы і будзе далей развівацца ў кірунку «даступна пра сур'ёзнае». Не знікне з поля зроку і аўтарская аналітычная праграма «Макей і Лаўроў. Пра палітыку», якая не мае дакладнай перыядычнасці, бо робіцца аператыўна і з важнай нагоды. Не выключана, што працягнецца любімы многімі эксклюзіўны праект АТН «Лёс гігантаў», які ўжо расказаў пра флагманы савецкай прамысловасці, знакамітыя прадуктовыя брэнды, навагоднія шэдэўры часоў СССР, а таксама пра прадпрыемствы, што дапамагалі зрабіць больш утульнымі кватэры савецкіх людзей. Калі чакаць пятага сезона «Лёсу гігантаў»? Паводле слоў Івана Эйсманта, дакладна не хутка, бо для здзяйснення такіх маштабных праектаў патрабуецца нямала часу і грошай, а перадусім — годная ідэя. «Асабіста мне хацелася б, каб героямі наступнага сезона сталі адметныя людзі — палітыкі, спартсмены, дзеячы мастацтва. Скажам, сэр Пол Макартні — хіба не гігант у сусветнай музыцы?»

Стаўка ж сёлета будзе зроблена на навіны. «У нас ёсць задумкі як наконт абнаўлення аблічча студыі «С-300», якая ўжо даўно не змянялася, так і наконт уласна падыходаў да фарміравання навін, — дзеліцца планамі кіраўнік АТН. — На цяперашні момант сетка вяшчання канала «Беларусь 1» пабудавана такім чынам, што выпускі навінаў выходзяць у эфір кожныя 3-4 гадзіны, без уліку раніцы: у 7, 8, 9, 12, 15, 19 гадзін і бліжэй да поўначы. Умоўна кажучы, калі ты прыязджаеш са здымак а палове чацвёртай, то твая інфармацыя пойдзе ў эфір толькі ў сямігадзінны выпуск. Зразумела, у такім тэмпе надзвычай складана канкураваць з інтэрнэтам, дзе навіны публікуюцца ледзьве не падчас падзеі, нават знятыя на мабільнік і адразу выкладзеныя ў сеціва. Таму мы набылі новае абсталяванне, якое дазволіць выходзіць у прамы эфір не праз спадарожнік, а па GSM-сувязі, — гэта паскорыць працэс і зробіць яго больш танным, дый колькасць прамых уключэнняў павялічыцца». Акрамя таго, АТН, ідучы ў нагу з часам, збіраецца нарошчваць сваю прысутнасць у сацыяльных сетках і на YouTube, развіваць уласныя інтэрнэт-праекты («Козел пра футбол», «Атрымай ляшча!», «ТОП_net»), анлайн-канферэнцыі, а таксама інтэрнэт-стужку навін.

Сярод планаў АТН — павялічыць колькасць сюжэтаў на беларускай мове.






***— Што наконт перамен тэматычных? Многія гледачы не ў захапленні, што на нацыянальным канале штодня ажно чатыры выпускі крыміналу і здарэнняў і ўсяго адзін, напрыклад, спартыўны...***

— Але пры гэтым, заўважу, у «Зоны Х» стабільна высокія рэйтынгі, — усміхаецца Іван Эйсмант. — Мы ні ў якім выпадку не імкнёмся да таннай папулярнасці за кошт «чарнухі», інакш закупалі б бясконцыя дэтэктыўныя серыялы, як робяць некаторыя тэлеканалы. Наадварот, задача «Зоны Х» — расказаць не толькі пра здзейсненыя злачынствы, але і пра іх раскрыццё, магчыма, перасцерагчы людзей і прадухіліць новыя здарэнні. Згодны, што выпуск спартыўных навін па буднях усяго адзін, але існуе канал «Беларусь 5», які ў поўным аб'ёме закрывае гэту нішу. Культурніцкую тэматыку прапануе гледачам «Беларусь 3». Мы ж адлюстроўваем грамадска-палітычнае жыццё краіны, таму перадусім працуем у гэтым кірунку.

***— З пазіцыі «гуляючага трэнера», адначасова і карэспандэнта, і кіраўніка, чаго найперш бракуе беларускім навінам?***

— Мы абмяркоўваем гэта на планёрках і прыходзім да высновы, што часцяком не хапае... тэм. Усё ж у нас краіна адносна невялікая, далёка не тыя маштабы, як, напрыклад, у суседняй Расіі, дзе могуць сабе дазволіць выбіраць «самы сок» са шматлікіх рэгіёнаў. У Беларусі інфармацыйных нагодаў менш — мабыць, гэта добра для большасці людзей, бо сведчыць пра спакойнае, зладжанае жыццё, але журналісту ў такіх умовах працаваць вельмі няпроста. Яшчэ адна істотная праблема — як ні дзіўна, кадравая. Кожны год журфак БДУ пакідаюць дзясяткі выпускнікоў, але частка з іх «раствараецца» на прасторах суседніх краін, а многія наогул не рэалізуюць сябе ў прафесіі і сыходзяць у іншыя сферы.

## Шанц даецца ўсім

Навіны на сучасным тэлебачанні робіць пераважна дзяўчаты. «Для мяне гэта дзіўна, але журналістыка ўсё больш ператвараецца ў жаночую прафесію, — разводзіць рукамі Іван Міхайлавіч. — Нам пастаянна не хапае мужчын у кадры, і на кастынгах мы робім упор менавіта на іх — прычым шукаем не толькі моладзь, але і сталых людзей, якія былі б цікавымі старэйшаму пакаленню».

Некаторыя любяць упікнуць БТ за «нецікавасць». Але, заўважаюць у адказ прафесіяналы знутры тэлебачання, многія з такіх крытыкаў, заяўляючы аб сваіх намерах зрабіць з сюжэта цукерку, «здзімаюцца» яшчэ на этапе напісання тэксту. Хоць шанц праявіць сабе, паводле слоў кіраўніка АТН, даецца ўсім творчым і таленавітым асобам, хто ўмее і жадае шмат працаваць на вынік.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**Фота прадастаўлена прэс-службай БТРК.**

## Серада, 5 кастрычніка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**9.10, 22.05** Серыял «След».
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00** Серыял «Жаночы доктар».
**12.10, 16.35** Серыял «Сямейныя меладрамы-6».
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Серыял «Дом з ліліямі».
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.05** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.40** Дзень спорту.
**0.55** Серыял «Мечаны».

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.15** Тэлебарометр.
**9.05, 20.00** Дэтэктыў «Такая работа».
**9.55, 21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**10.55** «Арол і рэшка. На краі свету». Трэвэл-шоу.
**11.50, 17.15** Серыял «Мая цудоўная нянька».
**12.20, 17.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**13.20, 18.55** Серыял «Васьмідзясятыя».
**14.25** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.10, 22.20** Трылер «Анёл ці дэман».
**17.10** Хачу ў тэлевізар!
**22.10** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.25** Серыял «Як я сустрэў вашу маму».



### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.15, 18.15, 21.00** Навіны культуры. «Калейдаскоп».
**7.50, 12.30, 19.00** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**8.00, 16.50** «Вечны ключ». Драма. Фільм другі.
**9.25, 20.00** «Адваротны бок Месяца». Дак. фільм «Чалавек, які ўзважыў святло».
**10.05** «Месяцам быў поўны сад». Драма.
**11.50** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастачкі, графіка Ларысы Герлаван.
**12.40** «Жыві і памятай». Драма.
**14.20** «Залаты шлягер-2015». «Усё лепшае для Вас...» Залатыя хіты айчыннай і замежнай музыкі.
**15.30** «Тартак». Кінааповесць.
**18.35. 23.25** «Ды@блог». Пра прыгожае.
**19.05** «У гасцях у Барыса Аверына».
**20.40** «Калыханка».
**21.15** «Галоўны канструктар». Драма.

### Беларусь 5

**7.25, 19.05, 22.15** Пра спорт. Навіны.
**7.35** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/16 фіналу. Першы матч. «Юнацтва-Мінск» (Беларусь) — «Фрэлунда» (Швецыя).
**9.30, 16.00** Тэніс. Турнір WTA. Пекін.
**15.30** Авертайм.
**18.05** Фактар сілы.
**18.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**19.15** Козел пра футбол.
**19.35** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**20.05** Слэм-данк.
**20.35** Баскетбол. Ліга чэмпіёнаў. 2-і кваліфікацыйны раўнд. «Цмокі-Мінск» (Беларусь) — «Нагарыя» (Ізраіль).
**22.25** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Лакаматыў» (Яраслаўль).

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Пра каханне».
**15.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** Серыял «Татавы дочкі».
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** Серыял «Тонкі лёд».
**22.55** «Беларусь без межаў з гуртам «Без билета».
**23.45** Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».
**1.40** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.00** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.35** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Тэрыторыя памылак».
**15.30** «Вадзіць па-руску».
**15.40** «Следакі». Серыял.
**16.10** «Аўтапанарама».
**16.50** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**17.10** «Ведай нашых!»
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.55** «Знахар». Серыял.

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**6.30, 2.25** «Экстрасэнсы. Па той бок іншага свету».
**7.00** Добрай раніцы, свет!
**9.00** Серыял «Леднікоў».
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 19.20** Серыял «Востраў непатрэбных людзей».
**16.15** Серыял «Невідзімкі».
**17.10, 2.55** Серыял «Таварышы паліцэйскія».
**22.00** Маст. фільм «Каханы па найму».
**23.45** Ток-шоу «Слова за слова».
**0.40** Маст. фільм «Двайное прозвішча».
**4.30** Маст. фільм «Музычная гісторыя».

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.30** Серыял «Бумеранг з мінулага».
**19.10, 20.40** Серыял «Каменская».
**21.45, 23.10** Серыял «Чаўночніцы».
**23.50** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».
**0.30** «Каманда» з Рамзанам Кадыравым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**8.30** «Студыя Юліі Высоцкай».
**9.00** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25** Серыял «Ляснік».
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 23.05** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «Тайны следства».
**14.20** Серыял «Апергрупа».
**16.25** Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40** Серыял «Пенсільванія».
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00** «Вялікія бацькі». Ульянаў.

### 8 канал

**7.00, 14.20, 19.10, 21.05, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** «Мультпарад».
**7.25, 14.30** Камедыя «Гарадскія дзяўчынкі».
**8.50, 17.50** Серыял «Тытанік».
**9.40** Серыял «Маскоўская сага».
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00** Прыгоды «У пошуках бурштынавага пакоя».
**12.50** Дэтэктыў «Алмаз Джэру».
**14.25, 16.25, 17.45, 19.15, 21.00** «Хатняя крама».
**16.30** «Дзецям пра звяранят».
**16.55** Серыял «Жаночы дэтэктыў».
**18.45** «Мой любімы гадаванец».
**19.25** Серыял «Чорны спіс».
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** Драма «Тэрыторыя».

### ВТБ

**6.00, 17.20** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.50** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.10, 15.10** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонiны».
**9.30** Серыял «Два бацькі, два сыны 2».
**10.10, 5.00** Серыял «Косці».
**11.20, 23.30** «Уральскія пельмені».
**12.00, 20.20** Серыял «Мамачкі 2».
**13.10** Камедыя «Правадыр разнаскурых».
**15.30** Серыял «Апошні з Магікян 4».
**16.10, 19.10** Серыял «Маладзёжка».
**21.30** Меладрама «Пацалунак праз сцяну».
**0.10, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.30, 3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».
**3.00** «Дурні і дарогі».
**4.00** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 23.50** Міжнародны Дзень настаўніка. «Дзённік дырэктара школы». Маст. фільм.
**12.30** «Сусветныя скарбы культуры».
**12.50, 20.45** «Правілы жыцця».
**13.15** «Пешшу...» Масква рамантычная.
**13.45** «Дзень за днём». Серыял.
**14.45** «Дрэва жыцця». Дак. фільм.
**15.10** Штучны адбор.
**15.50** «Свет, закінуты ў акіяне». Дак. фільм.
**16.45** Дакументальная камера. «Лукіна Вісконці. Філасофія гісторыі».
**17.30** Дзяржаркестру — 80! Дырыжор Васіль Пятрэнка. Саліст Дзяніс Кажухін. Творы Л. Бернстайна, Ф. Ліста, П. Чайкоўскага.
**18.35** «Антон Макаранка. Выхаванне — лёгкая справа». Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Абсалютны слых».
**21.15** Ступені цывілізацыі. «Заваяванне Сямі мораў». Дак. фільм.
**22.15** Улада факта. «Іспанія: паміж дыктатурай і сепаратызмам».
**23.00** «Рэгтайм, або Разарваны час». «Тры расказы пра вайну».
**23.45** Мастсавет.
**1.05** «Трынаццаць плюс...» Віталь Гінзбург. Дак. фільм.
**1.45** «Pro memoria». «Усход і ўсход».

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Маладзёжная рэвалюцыя 60-х». 2005 год.
**7.05, 8.40, 9.40, 11.00, 13.35, 15.40, 19.00, 20.40, 21.40, 1.35, 3.40, 5.45** Музычная настальгія.
**7.30** «Гэты фантастычны свет». Інсцэніроўка апавяданняў І. Яфрэмава і Р. Джоўнса. 1981 год.
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітоўскім: «Мой першы заробак». 2006 год.
**12.50** Маст. фільм «Старэйшы сын».
**17.05** «Зямля—Паветра». Пётр Мамонаў. 2003 год.
**18.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. Тэма: «Творчасць Булата Акуджавы». 2004 год.
**19.25** Тэлеспектакль «Ліка». 1978 год.
**23.00** «Песня-79». 1-е аддзяленне.
**0.00** Маст. фільм «Печкі-лавачкі».
**1.50** «Мы вас любім!» Канцэрт гурта «Воскресение». 1994 год.
**3.00** «Рок-урок». Шмат музыкі. 1993 год.
**4.00** Тэлеспектакль «Ну, публіка!» 1976 год.

### EuroSport 1

**4.00** Футбол. Чэмпіянат MLS. Найлепшыя моманты.
**4.30, 7.30, 0.00** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**5.30, 8.30, 11.00, 1.30** Футбол. Чэмпіянат свету сярод дзяўчат (U-17).
**7.00, 1.00** Футбол. «ФІФА».
**9.30** Аўта- і матаспорт. Тэст драйв.
**9.45** Парусны спорт.
**10.00, 18.00** Веласпорт. Бенш — Шыме — Бенш.
**12.00, 19.00, 2.30** Снукер. European Masters.
**17.00, 23.00** Watts.
**23.45** Трыял.

### Кінакамедыя

**1.05** Камедыя «Забойны футбол».
**2.55** Камедыя «Развод па-італьянску».
**4.45, 14.00, 14.55, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**05.05** Прыгоды «Фантамас».
**6.55** Прыгоды «Фантамас разбушаваўся».
**8.40** Прыгоды «Фантамас супраць Скотланд-Ярда».
**10.30** Камедыя «Што, калі Санта... зноў?»
**12.10** Камедыя «Каханне і лімоны».
**14.15, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Муж двух жонак».
**17.45** Камедыя «Уік-энд у Парыжы».
**19.30** Камедыя «Закусачная на колах».
**21.25** Камедыя «Я, тата і сабака».
**23.15** Камедыя «Давай, да пабачэння!»

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.35** «Доктар І...»
**8.05, 18.55, 1.35** «Асколкі». Серыял.
**9.45, 3.55** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.30** «Сляпая».
**12.30** «Варажбітка».
**13.35** «Паралельны свет».
**14.30** «Шафа».
**15.20** «Здзелка».
**15.50** «Жанна, пажані».
**16.50, 21.40** «Рэвізора».
**17.55** «Тайны следства». Серыял.
**20.45, 0.45** «Магазіна».
**22.40, 5.25** «Зоркі і містыка».
**23.15** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.00** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**3.10** «Нераскрытыя тайны».

### ТБ1000

**6.10, 18.05** Меладрама «Найлепшае ўва мне».
**8.15** Драма «Джо».
**10.15** М/ф «Прыгоды Дэспера».
**11.55** Прыгоды «Каратэ-хлапчук».
**14.20** Трылер «Турыст».
**16.05** Драма «Цёмная даліна».
**20.10** Фантастыка «Госця».
**22.20** Камедыя «Прасцячка».
**0.10** Драма «Монстр».
**2.10** Камедыя «Непатрэбныя рэчы».
**4.10** Трылер «Прафесіянал».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Меладрама «Восьмае сакавіка».
**8.15** Камедыя «Вайна полаў».
**10.10** Драма «Гарпастум».
**12.20** Старое добрае кіно. Трагікамедыя «Мастацтва жыць у Адэсе».
**14.20** Меладрама «Платон».
**16.10** Баявік «Параграф 78».
**18.40** Камедыя «Поўнае пераўтварэнне».
**20.20** Меладрама «КосцяНіка. Час лета».
**22.10** Іншае кіно. Драма «Белая белая ноч».
**0.15** Фэнтэзі «Ваўкадаў».
**2.35** Меладрама «Вораг нумар адзін».
**4.20** Драма «Край».

### National Geographic

**6.00** Навука будучыні.
**6.50** Як перамагчы ва ўсім.
**7.10, 9.30, 13.25, 17.10, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.55, 14.55, 21.00, 0.50, 4.00** Сапраўдны суперкар.
**8.45, 15.40, 21.45, 1.40, 4.50** Аўта-SOS.
**10.20, 18.00** Неверагодныя машыны.
**11.05** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**11.55, 14.10, 19.30, 23.20, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.
**12.40, 18.40, 2.30** Космас. Прастора і час.
**16.30, 22.30** Амерыканскае зацьменне.
**20.10** Чалавек супраць YouTube.
**0.05** Эвакуацыя Зямлі.

### Discovery

**8.00** Чыгунка Аляскі.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Багажныя войны.
**11.00** Стальныя хлопцы.
**12.00** Металаломшчыкі.
**13.00** Паляўнічыя на рэліквіі.
**14.00** Чыгунка Аляскі.
**17.00, 22.00, 2.55** Харлі і Дэвідсан.
**18.00** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**1.00, 6.20** Салдаты няўдачы.
**1.30, 6.45** Катастрофа на колах.
**2.00, 4.40** Самагоншчыкі.

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** У пачатку тыдня вы можаце атрымаць весткі, якія вас засмуцяць. Не ўспрымайце ўсё блізка да сэрца і не малюйце сабе карціну адмоўнага развіцця падзей. У хуткім часе ў вашым жыцці з'явяцца новыя падзеі і новыя варыянты развіцця сітуацыі. Неабходна змяніць стратэгію ў бізнесе, каб не патрапіць у няёмкае становішча. У панядзелак збярыцеся з сіламі і пастарайцеся не прапусціць перамены, якія адбываюцца вакол вас. Важныя справы лепш вырашаць у аўторак і суботу. Нядзелю прысвяціце адпачынку і аналізу бягучых спраў і падзей.



**ЦЯЛЕЦ.** У панядзелак расслабляцца не варта, падзеі могуць запатрабаваць напружанай работы думкі і, магчыма, інтэнсіўнага перамяшчэння ў прасторы. Давядзецца шмат што зразумець і прааналізаваць. Пачынаючы з аўторка, лёс будзе выпрабоўваць вас на трываласць. Публічныя выступленні ў сярэдзіне і канцы тыдня прынясуць поспех і прызнанне. Падарожжы і змена месца жыхарства пойдуць на карысць. Вам неабходна знаёмства з новымі людзьмі, звыклы круг стаў занадта цесны. Тыдзень спрыяльны для здзяйснення самааддадных учынкаў на карысць не толькі сябе, але і блізкаму атачэнню, родным.



**БЛІЗНЯТЫ.** Чакаецца дастаткова вострая барацьба з канкурэнтамі, аднак менавіта ў вас вялікія шанцы выйсці з яе пераможцам і даказаць навакольным сваю здольнасць бліскуча пераадольваць шматлікія цяжкасці. Можаце апынуцца ў такой сітуацыі, што давядзецца зрабіць выбар, ад якога будзе залежаць ваш матэрыяльны дабрабыт, а можа і не толькі ён. Не сумнявайцеся ў сабе — вы зробіце правільны выбар. Аўторак і субота парадуюць новымі ўражаннямі, культурнымі падзеямі і сяброўскімі зносінамі. Выхадныя правядзіце з каханым чалавекам.



**РАК.** З'явіцца шанц паказаць сябе ва ўсёй красе, праявіўшы свае здольнасці. Гэта дапаможа знайсці новых сяброў і аднадумцаў. Паспрабуйце пачаць ажыццяўленне планаў, якія раней адкладалі, усё ніяк не адважваючыся да іх прыступіць. Ёсць шанц, што вам прапануюць больш прэстыжную і высокааплатную работу. У пятніцу пастарайцеся не перакладаць свае праблемы на чужыя і нават на родныя плечы, вырашыць іх павінны вы самі. У суботу адпачніце, забудзьцеся пра праблемы і сумныя думкі.



**ЛЕЎ.** На гэтым тыдні традыцыйны падыход да вырашэння праблем не заўсёды будзе ўдалым: магчыма, варта перагледзець некаторыя свае погляды на жыццё і людзей. У сярэдзіне тыдня можа стаць сумна. Таму што ўсё ўжо было: тыя ж людзі, тыя ж сітуацыі, падобныя словы і ваша на іх рэакцыя. У выхадныя сямейныя праблемы могуць абрынуцца, як снег на галаву, так што загадзя набярыцеся сіл і цярпення для іх вырашэння. Тыдзень запатрабуе ўважлівасці і засяроджанасці, прымаць рашэнні варта толькі кіруючыся пэўнымі фактамі, а не асабістымі сімпатыямі.



**ДЗЕВА.** Добры тыдзень для таго, каб скончыць незавершанае. У вашых сілах змяніць адносіны з навакольнымі ў лепшы бок. У панядзелак і пятніцу лепш не ўступаць у спрэчкі, яны не прынясуць нічога канструктыўнага. Аўторак спрыяльны для паездак, спатканняў. У чацвер чакайце цікавай інфармацыі, якая дазволіць вырашыць пытанні кар'еры. Не забывайцеся пра сям'ю і дом, паспрабуйце надаць больш увагі блізкім.

## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** Усе думкі тыдня будуць нязменна праводзіць да разважання пра адпачынак. А паколькі летні адпачынак ўжо ззаду, паспрабуйце хоць бы не перагружаць сябе работай. Тым больш, што ў офісе або на вытворчасці ўсё будзе адносна спакойна. У панядзелак можна лёгка зняць напружанасць у адносінах з партнёрамі, далікатна абмеркаваць узаемныя абавязацельствы. У сярэдзіне тыдня павялічыцца колькасць спантанных знаёмстваў, але яны наўрад ці будуць рамантычнымі. У суботу зможаце ліквідаваць прыкрыя непаразуменні ў адносінах з дзецьмі. У нядзелю пастарайцеся беражліва да фінансаў, не расходуйце лішняга.

**СКАРПІЁН.** Супакойцеся і не мітусіцеся, плывіце па цячэнні. Хутка яно само вынесе вас туды, куды трэба. На рабоце ніякіх праблем не чакаецца. Начальства вас шануе і ўлічыць вашы пажаданні. Вам варта набрацца цярпення і быць больш вытрыманым. Паспрабуйце рацыянальна расходаваць сілы, пазбягайце перагрузак. Хоць бы кароткі адпачынак проста неабходны. Цяпер самы час задумацца пра падарунак для блізкага чалавека або пра арганізацыю сямейнага свята.

**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні лепш за стыльнае адзенне і мадэльную прычоску вас упрыгожаць такія якасці, як дыпламатычнасць і цярпенне. Жаданне бачыць свет каля сваіх ног зразумелае, але давядзецца ўсё ж некалькі прыцішыць апетыты. Добра ўжо тое, што навакольныя вас цэняць і паважаюць. Не забывайце пра свой дом, пажадана больш часу прысвяціць навядзенню парадку — пазбаўцеся ад непатрэбнага хламу і старых рэчаў. У суботу, вырашаючы пытанне буйных пакупак, парайцеся з блізкімі.

**КАЗЯРОГ.** Наладзяцца адносіны з калегамі і дзелавымі партнёрамі, вас ацэняць па заслугах. Будзеце шмат кантактаваць, перамовы пройдуць паспяхова. Такім жа ўдалым будзе і афармленне папер, дакументаў. У сераду прапановы, якія атрымаеце ад дзелавых партнёраў, магчыма, пацешаць небывалым прыбыткам. А вось выхадныя дні, хутчэй за ўсё, пройдуць самотна і пасіўна. Але не падайце духам, а адпачніце ад мітусні. Добра ў гэты час заняцца справамі, звязанымі з мастацтвам, творчасцю, самапазнаннем.

**ВАДАЛЕЙ.** У пачатку тыдня будзеце больш уважлівыя да пачуццяў іншых людзей, што дазволіць не толькі дамагчыся іх прыхільнасці, але і ў цэлым палепшыць адносіны як з блізкімі людзьмі, так і не вельмі. Наступае час для самаўдасканалення, вы адчуеце, што час нешта мяняць, пазбавіцца ад забабонаў і комплексаў. У гэты перыяд вашы недахопы будуць асабліва кідацца ў вочы, аднак паспрабуйце не рэагаваць на крытыку занадта хваравіта, вельмі хутка вы навучыцеся ад дасканаласці яшчэ на пару прыступак. У выхадныя пастарайцеся засцерагчы сябе ад непатрэбных кантактаў.

**РЫБЫ.** На гэтым тыдні ў вас амаль заўсёды будзе выбар: уключацца ў падзеі ці застацца па-за імі. Можа прадставіцца выдатная магчымасць для творчага росту і развіцця. У сераду і чацвер не выключаны канфліктныя сітуацыі з навакольнымі, прычым вы самі можаце іх правакаваць. Паспрабуйце стрымацца і прамаўчаць, каб потым лішні раз не засмучацца. Памятайце, што цяпер лепш разлічваць толькі на свае сілы, бо партнёры могуць падвесці. У выхадныя атрымаецца нарэшце расслабіцца і спакойна адпачыць.

## Чацвер, 6 кастрычніка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.55** Зона Х.
**9.10, 22.15 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Жаночы доктар».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Дом з ліліямі».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.15** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Буйным планам.
**0.50** Дзень спорту.
**1.05 Серыял «Мечаны».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.20** Тэлебарометр.
**9.05, 20.00 Дэтэктыў «Такая работа».**
**10.00, 21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**11.00** «Арол і рэшка. На краі свету». Трэвел-шоу.
**12.00, 17.15 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**12.30, 17.55 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**13.30, 18.55 Серыял «Васьмідзясятыя».**
**14.30** «Моду народу».
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.15, 22.25 Трылер «Анёл ці дэман».**
**22.10** Спортлата 6 з 49, КЕНО.
**23.30 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.35, 18.15, 21.00** Навіны культуры. «Калейдаскоп».
**7.55, 16.55 «Вечны кліч».**
**Драма. Фільм другі, заключная серыя.**
**9.15, 20.00** «Адваротны бок Месяца». Дак. фільм «Першы фізік Расіі».
**9.55 «Галоўны канструктар». Драма.**



**12.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці жывапісца і педагога Сяргея Каткова.
**12.50** «25+25». Юбілейны канцэрт заслужанага артыста Расіі Сяргея Рагожына.
**15.10 «Люстэрка». Драма.**
**18.35** «Сіла веры».
**19.00** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**19.05** «У гасцях у Барыса Аверына».
**20.40** «Калыханка».
**21.15 «Гэта пачалося ў Неапалі». Камедыя.**

### Беларусь 5

**7.20, 19.00, 21.55** Пра спорт. Навіны.
**7.30, 14.30** Тэніс. Турнір WTA. Пекін.
**13.35** Козел пра футбол.
**13.55** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**15.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Жанчыны. 1/16 фіналу. Першы матч. «ФК Мінск» — «Барселона» (Іспанія).
**18.00** Спорт-кадр.
**18.30** Фактар сілы.
**19.10** Авертайм. КХЛ.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Віцязь» (Маскоўская вобл.) (У перапынку — Авертайм. КХЛ.)
**22.05** Грэплінг. Чэмпіянат свету.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Пра каханне».
**15.15, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Трэба разабрацца».
**21.30 Серыял «Тонкі лёд».**
**23.20 Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».**
**1.15** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.40** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.35** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**15.40 «Следакі». Серыял.**
**16.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**16.50** «Мінск і мінчане».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзіўная справа».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.20** «Аўтапанарама».
**0.35 «Знахар». Серыял. Заключныя серыі.**

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**6.30, 2.15** «Экстрасэнсы. Па той бок іншага свету».
**7.00** Добрай раніцы, свет!
**9.00, 0.40 Маст. фільм «Нядзельны тата».**
**10.40 Маст. фільм «Каханы па найму».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 19.20 Серыял «Вострaў непатрэбных людзей».**
**16.15 Серыял «Невідзімкі».**
**17.10, 2.45 Серыял «Таварышы паліцэйскія».**
**22.00 Маст. фільм «Дом, мілы дом».**
**23.45** Ток-шоу «Слова за слова».
**4.20 Маст. фільм «Сэрцы чатырох».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Вестi.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Бумеранг з мінулага».**
**19.10, 20.40 Серыял «Каменская».**
**21.45, 23.10 Серыял «Чаўночніцы».**
**23.50** «Паядынак».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**8.30** «Студыя Юліі Высоцкай».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25 Серыял «Ляснік».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 23.05** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «Тайны следства».
**14.20 Серыял «Апергрупа».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Пенсільванія».**
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Марскія д'ябалы».**

### 8 канал

**7.00, 14.15, 19.15, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** «Мультпарад».
**7.20, 14.30 Камедыя «Прыкінься маім хлопцам».**
**8.45, 18.10 Серыял «Тытанік».**
**9.40 Серыял «Маскоўская сага».**
**10.30** Дак. фільм «Разлік на бяспеку».
**11.00 Драма «Дзве жанчыны».**
**12.40 Меладрама «Хаціка — самы верны сябар».**
**14.20, 18.00, 21.00** «Хатняя крама».
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**17.00 Серыял «Жаночы дэтэктыў».**
**19.00** «Фэшн is my прафэшн».
**19.25 Серыял «Чорны спіс».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Фантастыка «Роўныя».**
**23.05 Серыял «Закон і парадак».**

### ВТБ

**6.00, 17.20** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.50** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.10, 15.00** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонiны».
**9.30** Серыял «Два бацькі, два сыны 2».
**10.10, 5.00** Серыял «Косці».
**11.20** «Уральскія пельмені».
**12.00, 20.20** Серыял «Мамачкі 2».
**13.10** Меладрама «Пацалунак праз сцяну».
**15.30** Серыял «Апошні з Магікян 4».
**16.10, 19.10** Серыял «Маладзёжка».
**21.30** Камедыя «Аб чым маўчаць дзяўчаты».
**23.20, 3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**0.00** Еўрапейскі покерны тур-нір.
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка».
**3.00** «Дурні і дарогі».
**4.00** «Лаві момант».
**4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 23.50** «Каломба». Серыял.
**12.30** Сусветныя скарбы.
**12.50, 20.45** «Правілы жыцця».
**13.15** «Расія, любоў мая!» «Алтай. Свет гукаў і фарбаў».
**13.45** «Дзень за днём». Серыял.
**15.10** «Абсалютны слых».
**15.50, 21.15** «Завяванне Сямі мораў». Дак. фільм.
**16.45** «Аляксей Ляпуноў. Асоба дваранскага паходжання». Дак. фільм.
**17.30** Дзяржаркестру — 80! Дырыжор Уладзімір Юраўскі. Д. Шастаковіч. «Гамлет».
**18.35** «Мікалай Парфёнаў. Яго ведалі толькі ў твар...» Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**22.10** «Культурная рэвалюцыя».
**23.00** «Рэгтайм, або Разарваны час». «Франсіска Гоя ў Калагрыве».
**23.45** Мастсавет.
**1.00** «Зорны летуценнік. Павел Клушанцаў». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Мой першы заробак». 2006 год.
**6.50** Маст. фільм «Старэйшы сын».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**9.40, 11.00, 13.00, 14.45, 15.40, 21.40, 1.05, 2.40, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаны ў СССР».
**11.05** «Зямля—Паветра». Пётр Мамонаў. 2003 год.
**12.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казялковай. Тэма: «Творчасць Булата Акуджавы». 2004 год.
**13.25** Тэлеспектакль «Ліка». 1978 год.
**17.00** «Песня-79». 1-е адздяленне.
**18.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**19.00** Маст. фільм «Дрэнны добры чалавек».
**20.35** Спявае ВІА «Синяя птица». 1979 год.
**23.05** Фільм-канцэрт Марылі Радовіч «Фатаграфія ў лiпені». 1987 год.
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Маладзёжная рэвалюцыя 60-х». 2005 год.
**1.30** «Гэты фантастычны свет». Інсцэніроўка апавяданняў І. Яфрэмава і Р. Джоунса. 1981 год.

### EuroSport 1

**4.00, 8.30, 17.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**7.00** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**8.00** Футбол. «ФІФА».
**11.00, 18.30, 2.00** Футбол. Чэмпіянат MLS. Найлепшыя моманты.
**11.30, 19.00, 2.30** Снукер. European Masters.
**23.00, 0.30** Футбол. Чэмпіянат свету сярод дзяўчат (U-17).

### Кінакамедыя

**0.50** Камедыя «100 мільёнаў еўра».
**2.35** Камедыя «Горка!»
**4.25** Меладрама «Круты паварот».
**6.25** Камедыя «Кур'ер».
**8.10** Дэтэктыў «Шарада».
**10.10** Мюзікл «Прагулка па сонечнаму святлу».
**11.55** Камедыя «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях».
**14.00, 14.55, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Я вяртаюся да мамы».
**17.45** Камедыя «Гіганцік».
**19.30** Камедыя «Дзеці сексу не перашкода».
**21.25** Меладрама «Я ніколі не буду тваёй».
**23.15** Прыгоды «Фантамас».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.40** «Доктар І...»
**8.10, 19.00, 1.55** «Асколкі». Серыял.
**9.45, 3.55** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.30** «Сляпая».
**12.30** «Варажбітка».
**13.35** «Параленьны свет».
**14.35** «Шафа».
**15.25** «Здзелка».
**15.55** «Магазіна».
**16.55, 21.50** «Рэвізора».
**17.55** «Тайны следства». Серыял.
**20.55, 1.05** «Паненка-сялянка».
**22.55, 5.25** «Зоркі і містыка».
**23.35** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.20** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.



**3.30** «Нераскрытыя тайны».

### ТБ1000

**6.10, 18.15** Меладрама «Кіт».
**8.10** Камедыя «Працяжка».
**10.10** Драма «Монстр».
**12.10** Фантастыка «Госця».
**14.25** Трылер «Прафесіянал».
**16.30** Камедыя «Непатрэбныя рэчы».
**20.10** Фэнтэзі «Уладар пярсцёнкаў: брацтва пярсцёнка».
**23.25** Трылер «Задыяк».
**2.10** Камедыя «Прадзюсары».
**4.25** Меладрама «Нешта навенькае».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Драма «Белая белая ноч».
**8.25** Меладрама «КосцяНіка. Час лета».
**10.10** Фэнтэзі «Ваўкадаў».
**12.35** Старое добрае кіно. Драма «Марыяна».
**14.10** Меладрама «Вораг нумар адзін».
**16.10** Драма «Край».
**18.20** Меладрама «Вязень старой сядзібы».
**20.20** Меладрама «Яшчэ адзін год».
**22.20** Камедыя «Іронія лёсу. Працяг».
**0.20** Драма «Нашчадкі».
**2.20** Меладрама «Дванаццаць месяцаў».
**4.05** Драма «Арда».

### National Geographic

**6.00, 12.40, 18.40, 2.30** Навука будучыні.
**6.50** Як перамагчы ва ўсім.
**7.10, 13.25, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.55, 14.55, 21.00, 0.50, 4.00** Ледзяная дарога.
**8.45, 15.40, 21.45, 1.40, 4.50** Непакорлівы востраў.
**9.30, 17.10** Сапраўдны супер-кар.
**10.20, 18.00** Аўта-SOS.
**11.05** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**11.55, 14.10, 19.30, 23.20, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.
**16.30** Грашовае сховішча ЗША.
**20.10** Чалавек супраць YouTube.
**22.30** Дзікі тунец.
**0.05** Эвакуацыя Зямлі.



### Discovery

**8.00** Чыгунка Аляскі.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Баявыя машыны.
**11.00** Чыгунка Аўстраліі.
**12.00, 0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**13.00** Смяротны ўлоў.
**14.00** Чыгунка Аляскі.
**17.00, 22.00, 2.55** Харлі і Дэвідсан.
**18.00** Чалавек і Сусвет.
**1.00, 6.20** Салдаты нябачныя.
**1.30, 6.45** Катастрофа на колах.
**2.00, 4.40** Самагоншчыкі.

# ШАШКІ
(«Звязда»)

**Выпуск №21**

Сёння нашым чытачам прапануем разгледзець новую дэбютную пастку з аналізу міжнароднага гросмайстра М. Норэля.

1. cd4 dc5 2. bc3 cd6 3. cb4 ba5 4. d:b6 a:c7 5. ed4 fg5 6. dc5 gf6

7. gh4 gf4 8. ab2? Шлях да перамогі за чорных адшукайце самастойна.

**№29**

**Белыя простыя**: a3, b2, b4, c1, c5, d2, e1, f2, g1, h2, h4 (11).

**Чорныя простыя:** a7, b8, c7, d6, d8, e7, f4, f6, f8, h6, h8 (11).



Знайдзіце яшчэ адну цікавую камбінацыю у партыі паміж

М. Урсу — Д. Леанідаў

1. cd4 fg5 2. gf4 gf6 3. dc5?! b:d4 4. e:c5 d:b4 5. a:c5 g:e3 6. f:d4 fg7

7. bc3 fe5 8. d:f6 g:e5 9. gf2 hg7 10. ab2 cb6! 11. de3 b:d4 12. e:c5 bc7

13. cd2 gf6 14. cb4 fg5 15. ba3 ef6! 16. de3 ef4 17. ed2 fe5! 18. cd6 Заканчэнне за чытачамі.

**№30**

**Белыя простыя:** a3, b4, d2, d6, e3, f2, h2 (7).

**Чорныя простыя:** a7, c7, d8, e5, f4, g5, h6 (7).

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Як мы ўжо паведамлялі, з 24 жніўня па 3 верасня ў курортным пасёлку Кранева (Балгарыя) адбыўся чэмпіянат свету сярод моладзі па шашках — 64 у шасці ўзроставых групах. Пасля пераможных выступленняў у турнірах па бліцу і хуткай гульні нашы юныя таленты дабіліся поспеху і ў класічнай праграме, якая доўжылася амаль тыдзень. Чэмпіёнкамі свету сталі Яўгенія Швед (да 8 гадоў), Дар'я Нікіфарава (да 10 гадоў), Вікторыя Мікалаева (да 13 гадоў), Яна Якубовіч (да 16 гадоў). Сярэбраныя медалі выйгралі Анастасія Барышава (да 23 гадоў) і Марат Леў (у хлопчыкаў да 10 гадоў). «Бронза» на рахунку Паліны Петрусёвай (да 16 гадоў).

**Праверце свае рашэнні.** Выпуск №20 ад 16.09.16.

**№27** f8, b4 (c5A) hh2, b8 x; A (f6) hf8, b6 (h2), g1 x.

**№28** g3 (D6,f4) f2, g5, e3, d8, b2, f6, e5 (g7) h8 (g3) d4 (h2) g1 x.

Дакладныя адказы даслалі А. Ліцвінаў, Ф. і В. Шульга (Мінск).

**Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск, e-mail: info@zviazda.by, або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

## Тэлесеткі

# ТАЛЕНТЫ — У ЭФІР

**На гэтым тыдні ў Мінску завяршыліся кастынгі новага маштабнага тэлевізійнага конкурсу «Талент краіны», зладжанага Спецыяльным фондам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, тэлеканалам АНТ і Беларускай акадэміяй музыкі.**

Да ўдзелу запрашаліся юнакі і дзяўчаты ва ўзросце ад 5 да 15 гадоў. Журы правяло папярэдні адбор кандыдатаў па чатырох кірунках: вакал, харэаграфія, інструментальнае майстэрства і арыгінальны жанр. Як зазначыла **кіраўнік дырэкцыі спецпраектаў тэлеканала АНТ Анжаліка МІКУЛЬСКАЯ**, на кастынгі было зарэгістравана больш за дзве тысячы заяў. Большасць юных артыстаў выбралі спевы. Міма за ўсё ўдзельнікаў аказалася ў арыгінальным жанры, затое многія з іх паказвалі без перабольшання цуды — некаторыя выхаванцамі цыркавых студый зацікавіліся прафесіяналы Белдзяржцырка...

Неўзабаве 48 шчасліўчыкаў, якія прайшлі адбор, пачнуць рыхтавацца да конкурсу. У тэлеэфір «Талент краіны» выйдзе ў лістападзе-снежні.

**Вікторыя ЗАХАРАВА**

## Пятніца, 7 кастрычніка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**8.50** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на свята Прасвятая Дзева Марыя Разарыя.
**9.10 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Жаночы доктар».**
**12.10, 17.45 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Дом з лілеямі».**
**21.00** Панарама.
**21.45** Нашы.
**22.05 Меладрама «Знахарка».**
**1.50** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 20.55** Тэлебарометр.
**9.05, 19.55 Дэтэктыў «Такая работа».**
**10.00** Рэпарцёр.
**10.55** Капейка ў капейку.
**11.20** «Анлайн». Скетчкам.
**11.50, 17.10 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**12.25, 17.45 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**13.25, 18.45 Серыял «Васьмідзясятыя».**
**14.35** «Моду народу».
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.15, 0.05 Трылер «Анёл ці дэман».**
**21.10, 23.45** Час футбола.
**21.45** Футбол. Чэмпіянат свету-2018. Кваліфікацыя. Нідэрланды — Беларусь. У перапынку:
**22.30** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**1.00** Футбол. Чэмпіянат свету-2018. Кваліфікацыя. Агляд.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабрананак».
**7.35, 11.35, 18.15, 21.00** Навіны культуры. «Калейдаскоп».
**7.50, 11.50, 19.00** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**8.00, 17.10 «Ніхто не заменіць цябе». Меладрама.**
**9.05, 20.00** «Наступны прыпынак... Месяц». Навукова-папулярны фільм.
**9.45 «Тартак». Кінааповесць.**
**11.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці жывапісца Ізраіля Басава.
**11.55 «Люстэрка». Драма.**
**13.40 «Гэта пачалося ў Неапалі». Камедыя.**
**15.20** «Легенды беларускай эстрады». «Чараўніцы свету».
**15.45** Анталогія «Славянскага базару». «Славянскі базар у Віцебску-2001».
**16.40** «СССР — музыка пад забаронай». Леанід Уцёсаў.
**18.35** «Камертон». Кампазітар Алег Елісеенкаў.
**19.05** «У гасцях у Барыса Аверына».
**20.40** «Калыханка».
**21.15** «Час кіно».
**21.25 «Перамажы д'ябла». Камедыя.**
**22.55** «Мелодыі лета». Зямля Высоцкага.

### Беларусь 5

**7.20, 19.15, 21.35** Пра спорт. Навіны.
**7.30, 16.00** Тэніс. Турнір WTA. Пекін. 1/4 фіналу.
**13.30** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Віцязь» (Маскоўская вобл.).
**15.30** Фактар сілы.
**18.05** «На шляху да ЧС-2018». Відэачасопіс.
**18.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**19.25** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Сталіца» (Мінск) — БЧ (Гомель).
**21.00** Піт-стоп.
**21.45** Грэплінг. Чэмпіянат свету.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Адваротны адлік». «Джульбарс і Дзіна. Сабакі службы «Д».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Час пакажа».
**16.20 Камедыя «Старыя-разбойнікі».**
**18.20** «Чакай мяне. Беларусь».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Голас». Новы сезон.
**23.00** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі».
**0.10 Драма «Пабочны эфект».**
**1.55** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.35** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Дзіўная справа».
**15.40 «Следакі». Серыял.**
**16.10** «Аўтапанарама».
**16.50** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**17.10** «Ведай нашых!»
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** 1/4 фіналу Міжнароднай лігі КВЗ.
**22.05** «Глядзець усім!»
**23.00** «Зямля. У пошуках стваральніка».
**0.00 Камедыя «Без пачуцця».**
**1.35** «Зорны рынг». Дайджэст.

### МІР

**6.00** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**6.30, 3.10** «Экстрасэнсы. Па той бок іншага свету».
**7.00** Добрай раніцы, свет!
**9.00, 1.45 Маст. фільм «Любімая жанчына механіка Гаўрылава».**
**10.30 Маст. фільм «Дом, мілы дом».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Серыял «Востраў непатрэбных людзей».**
**16.15** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.10, 4.00 Серыял «Дарога на востраў Пасхі».**
**19.20 Серыял «Пачаць спачатку. Марта».**
**22.50 Маст. фільм «Зіта і Гіта».**
**3.35** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**5.40** М/ф.

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Бумеранг з мінулага».**
**19.10, 20.40 Серыял «Каменская».**
**21.45, 23.10** «Гумарына».
**23.45 Маст. фільм «Непрыгожая Любоў».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**8.30** «Студыя Юліі Высоцкай».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25 Серыял «Ляснік».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 21.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.55** «Тайны следства».
**14.20 Серыял «Апергрупа».**
**16.25, 19.40 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**22.00** «Экстрасэнсы супраць дэтэктываў».
**23.25** «Большасць». Ток-шоу.
**0.35** «Таямнічая Расія».

### 8 канал

**7.00, 14.25, 19.10, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** «Мультпарад».
**7.20, 14.35 Камедыя «Утаймаванне свавольнай».**
**8.45 Серыял «Тытанік».**
**9.45 Серыял «Маскоўская сага».**
**10.45 Фантастыка «Роўныя».**
**12.25 Фантастыка «Пяты элемент».**
**14.25, 16.55, 18.00, 19.15, 21.00** «Хатняя крама».
**16.30** «Адшукваецца адпачынак».
**17.05 Серыял «Жаночы дэтэктыў».**
**18.10 Серыял «Вербная нядзеля».**
**19.25 Серыял «Чорны спіс».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Трылер «Начны ўцякач».**
**23.05 Серыял «Закон і парадак».**

### ВТБ

**6.00, 17.20, 5.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.50** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.10, 14.50** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Вароніны».
**9.30** Серыял «Два бацькі, два сыны 2».
**10.10, 5.00** Серыял «Косці».
**11.20, 23.30** «Уральскія пельмені».
**12.00, 20.20** Серыял «Мамачкі 2».
**13.10** Камедыя «Аб чым маўчаць дзяўчаты».
**15.30** Серыял «Апошні з Магікян 4».
**16.10, 19.10** Серыял «Маладзёжка».
**21.30** Камедыя «8 першых спатканняў».
**23.10, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**0.30** Скетч-шоу «Валера ТБ».
**1.30, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**2.30** Скетчкам «Студэнты».
**3.30** «Мільёны у сетцы».
**4.30** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.20** «Зорны летуценнік. Павел Клушанцаў». Дак. фільм.
**11.15, 23.50** «Каломба». Серыял.
**12.35, 2.40** Сусветныя скарбы.
**12.50** «Правілы жыцця».
**13.15** «Пісьмы з правінцыі». Сальвычагодск (Архангельская вобласць).
**13.45** «Дзень за днём». Серыял.
**15.10** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**15.50** «Завяяванне Сямі мораў». Дак. фільм.
**16.50** «Царская ложа».
**17.35** Дзяржаркестру — 80! Легендарны канцэрт у Маскоўскай кансерваторыі.
**18.20** 80 гадоў ДАСА. «Адзін і сто. Гісторыя дзяржаркестра». Дак. фільм.
**19.00** «Канстанцін Цыялкоўскі. Грамадзянін Сусвету». Дак. фільм.
**19.45, 1.55** «Шукальнікі». «Тайна строганаўскіх мільёнаў».
**20.30** Да 85-годдзя з дня нараджэння Юльяна Сямёнава. «Інфармацыя да развазання». Дак. фільм.
**21.15** «Сяроцка». Маст. фільм.
**22.35** «Лінія жыцця». Наталля Бесцям'янава.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** Партрэт пакалення. «Піянеры-героі». Маст. фільм.
**1.50** «Павольнае бістро». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» з Наталляй Казляковай. Тэма: «Творчасць Булата Акуджавы». 2004 год.
**7.05, 8.40, 9.40, 15.40, 19.30, 20.40, 23.25, 3.40** Музычная настальгія.
**7.25** Тэлеспектакль «Ліка». 1978 год.
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 4.00** «Нараджэнне ў СССР».
**11.00** «Песня-79». 1-е аддзяленне.
**12.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**13.00** Маст. фільм «Дрэнны добры чалавек».
**14.35** Спявае ВІА «Синяя птица». 1979 год.
**17.05** Фільм-канцэрт Марылі Радовіч «Фатаграфія ў ліпені». 1987 год.
**18.00** Маст. фільм «Чужая радня».
**20.00** Дак. фільм «Навіны дня. Хроніка нашых дзён».
**20.10, 22.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1957. 2009 год.
**21.00** «Колба часу». «1957 год».
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітковскім: «Мой першы заробак». 2006 год.
**0.50** Маст. фільм «Старэйшы сын».
**5.05** «Зямля—Паветра». Пётр Мамонаў. 2003 год.

### EuroSport 1

**4.00, 5.30, 15.45, 18.00, 23.00** Футбол. Чэмпіянат свету сярод дзяўчат (U-17).
**7.00, 10.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**9.30** Футбол. Чэмпіянат MLS. Найлепшыя моманты.
**11.30, 13.00, 21.05, 2.30** Снукер. European Masters.
**18.45, 0.35** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21.
**2.00** Футбол. «ФІФА».

### Кінакамедыя

**1.05** Прыгоды «Фантамас разбушаваўся».
**2.50** Прыгоды «Фантамас супраць Скотланд-Ярда».
**4.35** Камедыя «Забойны футбол».



**6.25** Меладрама «Двое — гэта занадта».
**8.30** Камедыя «Каханне і лімоны».
**10.15** Камедыя «Закусачная на колах».
**12.10** Камедыя «Я, тата і сабака».
**14.00, 14.55, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «К-9: Калядныя прыгоды».
**17.50** Меладрама «(Не)чаканы прынц».
**19.30** Камедыя «Няўдачлівыя».
**21.05** Камедыя «Шчаслівае сямейства».
**22.35** Дэтэктыў «Шарада».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.35** «Доктар I...»
**8.05, 19.00, 2.05** «Асколкі». Серыял.
**9.45, 4.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.30** «Сляпая».
**12.30** «Варажбітка».
**13.35** «Паралельны свет».
**14.30** «Шафа».
**15.20** «Здзелка».
**15.50** «Людзі пятніцы».
**16.50** «Рэвізора».
**17.55** «Знахаркі».
**21.00** «Людзі ў чорным». Фантастыка.
**22.50** «Зоркі. Тайны. Лёсы».
**23.45** «Каліфрнэія». Серыял.
**0.15** «Блэйд 2». Баявік.
**3.45** «Нераскрытыя тайны».

### ТБ1000

**6.10, 18.10** Фэнтэзі «Чарнільнае сэрца».
**8.10** Трылер «Задыяк».
**11.10** Фэнтэзі «Уладар пярсцёнкаў: брацтва пярсцёнка».
**14.15** Меладрама «Нешта навеньнае».
**16.10** М/ф «Прыгоды Дэспера».
**20.10** Камедыя «Выдатніца лёгкіх паводзін».
**22.10** Фантастыка «Жонка падарожніка ў часе».
**0.20** Драма «Доўгія заручыны».
**2.30** Драма «Станцыя «Фрутвейл».
**4.10** Драма «Джо».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Іронія лёсу. Працяг».
**8.25** Меладрама «Яшчэ адзін год».
**10.25** Драма «Нашчадкі».
**12.30** Старое добрае кіно. Драма «Паляванне на аднагога».
**14.10** Меладрама «Дванаццаць месяцаў».
**16.10** Драма «Арда».
**18.35** Драма «Адна вайна».
**20.20** Меладрама «Будзь са мной».
**21.40** Дэтэктыў «Хто я?»
**23.25** Камедыя «Любовь-морковь».
**1.20** Драма «Жыць».
**2.40** Меладрама «Васьмое сакавіка».
**4.15** Драма «Гарпастум».

### National Geographic

**6.00, 12.40, 18.40, 2.30** Навука будучыні.
**6.50** Як перамагчы ва ўсім.
**7.10, 13.25, 20.15, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.55, 14.55, 21.00, 0.50, 4.00** Уварванне на Зямлю.
**8.45, 15.40, 21.45, 1.40, 4.50** Эвакуацыя Зямлі.
**9.30, 17.10** Ледзяная дарога.
**10.20, 18.00** Непакорлівы востраў.
**11.05** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**11.55, 14.10, 19.30, 23.20, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.
**16.30, 22.30** Зона 51. Сакрэтныя файлы ЦРУ.
**0.05** Тайны гісторыі.

### Discovery

**8.00** Чыгунка Аляскі.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Склады.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Багажныя вайны.
**11.00** Аляска: сям'я з лесу.
**12.00** Завяяванне новых зямель.
**13.00** Плутон: першая сустрэча.
**14.00** Чыгунка Аляскі.
**17.00, 22.00, 2.55** Харлі і Дэвідсан.
**18.00** Паляванне на труфелі.
**0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**1.00, 6.20** Салдаты няўдачы.
**1.30, 6.45** Катастрофа на колах.
**2.00, 4.40** Самагоншчыкі.

## Субота, 8 кастрычніка

### Беларусь 1

**6.50** Існасць.
**7.15 Меладрама «Знахарка».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Буйным планам.
**9.40 Серыял «Сваты-6».**
**11.00** 50 рэцэптаў першага.
**12.10** Вялікі сэлфі-тур.
**12.50** Дача.
**13.25** Здароўе.
**14.20, 17.00 Меладрама «Сон як жыццё».**
**15.15** Краіна.
**18.40, 21.40 Меладрама «Справа была на Кубані».**
**21.00** Панарама.
**3.00** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00 Серыял «Класная школа».**
**7.55** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**8.55, 20.55** Тэлебарометр.
**9.00 Серыял «Шчаслівыя разам 3».**
**10.55 Выбар гледачоў. Анімацыйны фільм «Мадагаскар 3».**



**12.30** Капейка ў капейку.
**13.10** «Вялікая ілюзія на Кіпры».
**13.45** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**14.50** «Моду народу».
**15.45** «Бітва экстрасэнсаў. 13 сезон».
**17.55** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу.
**19.05** «Здзіві мяне 3». Талент-шоу.
**21.10 Баявік «Місія невыканальная 3».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.35 Трылер «Омен».**

### Беларусь 3

**8.00, 14.20, 17.45** Навіны культуры. «Калейдаскоп».
**8.15, 16.35 «Дамы запрашаюць кавалераў». Камедыя.**



**9.30** «Легенды беларускай эстрады». «Чараўніцы свету».
**9.55** Анталогія «Славянскага базару». «Славянскі базар у Віцебску-2001».
**10.50** «Апошні дзень». Марк Бернэс.
**11.25 «Два байцы». Драма.**
**12.40** «Бітва за Севастопаль». «Форт «Сталін».
**13.20** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.50** «Край».
**14.35** «Час кіно».
**14.45 «Пірасмані». Маст. фільм.**
**16.05** «Камертон». Кампазітар Алег Елісеенкаў.
**18.00** «Навукаманія».
**18.30 «Сабачае сэрца». Драма.**
**20.40** «Калыханка».
**21.20** «Засакрэчанае каханне. Прага жыцця». Дак. фільм.
**22.00 «Гаспадар тайгі». Маст. фільм.**
**23.20** «Бард-парад».

### Беларусь 5

**7.50, 21.20** Пра спорт. Навіны.
**8.00** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Сталіца» (Мінск) — БЧ (Гомель).
**9.30, 21.30** Тэніс. Турнір WTA. Пекін. 1/2 фіналу.
**11.30** Піт-стоп.
**12.00** Фактар сілы.
**12.30** Футбол. Кваліфікацыя да ЧС-2018. Нідэрланды — Беларусь.
**14.25** Футбол. Кваліфікацыя да ЧС-2018. Агляд гульнявога дня.
**14.55** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама-Мінск» — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна).
**17.00** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Дынама» (Масква).
**19.20** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. БГК ім. Мяшкова (Беларусь) — «Рэйн Лёвен» (Германія).
**20.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**23.35** Плаванне. Этап кубка свету. Доха.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00** (з субцітрамі), **16.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.05** Мультсерыял «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.00** «Ідэальны рамонт».
**11.55 Маст. фільм «Жывіце ў радасці».**
**13.15** 80 гадоў Леаніду Кураўлёву. «Гэта я ўдачна зайшоў!»
**14.15 Камедыя «Жыве такі хлопец!»**
**16.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Хто хоча стаць мільянерам?»
**17.20** «Удача ў прыдачу! з «Еўраопт».
**18.05** «Тэорыя змовы».
**18.50** «Мой бізнес».
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.35** «Усё складзецца».
**23.15** «МаксімМаксім».
**0.15** «Падмаскоўныя вечары».

### СТБ

**6.30 «Фірменная гісторыя». Серыял.**
**7.20** «Анфас».
**7.35 Камедыя «Блакітныя горы».**
**9.20** «Рамонт па-сумленнаму».
**10.05** «Ежа багоў».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35 «Дэмбельскі альбом». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 2.05 Камедыя «Ёлкі-палкі».**
**15.20** «Вадзіць па-руску».
**15.50** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**18.30** «Прагнасць».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Нам і не снілася».
**22.40 «Канферэнцыя маньякаў». Серыял.**

### МІР

**6.00, 8.20, 4.20** М/ф.
**6.20 Маст. фільм «Нядзельны тата».**
**7.55** «Саюзнікі».
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**9.30** «Мой лепшы сябар».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Здабытак рэспублік».
**10.45, 21.15 Маст. фільм «Формула кахання».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00 Маст. фільм «Зіта і Гіта».**
**16.15 Серыял «На шляху да сэрца».**
**23.00 Маст. фільм «Трэці лішні».**
**0.50 Маст. фільм «Дом, мілы дом».**
**2.30 Маст. фільм «Волга-Волга».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.35 Маст. фільм «Дом без выхаду».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.20 Маст. фільм «Дама з сабачкам».**
**13.10** Да 80-годдзя з дня нараджэння. «Эдмонд Кеасаян. Не толькі «Няўлоўныя».
**14.15** «Ха! Маленькія камедыі».
**14.40** «Гэта смешна».
**17.00** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55 Маст. фільм «Падмена ў адно імгненне».**
**0.05 Маст. фільм «Яшчэ кахаю, яшчэ спадзяюся...»**

### НТБ—Беларусь

**5.50** «Астрапрагноз».
**5.55, 8.20** Серыял «Дарожны патруль».
**8.00, 10.00, 14.00, 16.00** Сёння.
**8.40** «Вуснамі дзіцяці».
**9.25** «Іх норавы».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.05** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.05** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Удача ў дадатак!»
**14.15 Серыял «Следапыт».**
**16.20** НТБ-Бачанне. «Ракавая гаранка».
**17.15** «Следства вялі...»
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**19.55** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.50** «Ты не паверыш!»
**21.40 Маст. фільм «Перш чым я засну».**
**23.15** «Салтыкоў-Шчадрын шоу».
**0.05** «Аднойчы...»

### 8 канал

**9.00, 15.55, 18.40, 21.15, 23.40** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.40 Серыял «Вербная нядзеля».**
**10.35** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**10.45, 16.30, 18.45, 21.00** «Хатняя крама».
**11.00 Кінараман «Дарагі мой чалавек».**
**12.45 Драма «Анкор, яшчэ анкор!»**
**14.35** «Мультпарад».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.40, 18.55 Серыял «Што застанецца пасля цябе».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Трылер «Павуцінне хлусні».**

### ВТБ

**6.00, 4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30** «Мой тата крутейшы!»
**7.30, 13.00** «Ералаш».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.15** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.30** М/ф «Гадкае качаня і я».
**9.00, 23.10, 4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.30, 5.30** «Лаві момант».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** «Новае жыццё».
**13.00** Серыял «Апошні з Магікян 4».
**15.00** Камедыя «8 першых спатканняў».
**16.40** М/ф «Губка Боб — Квадратныя Штаны».
**18.20** «Ленінградскі Stand-up клуб».
**19.30** «Уральскія пельмені».
**21.00** Трылер «Паветраны маршал».
**0.00** Скетч-шоу «Валера ТБ».
**3.30** «Дурні і дарогі».
**4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.35** «Сярожа». Маст. фільм.
**11.50** «Больш чым каханне». Марк Бернэс і Лілія Бадрова.
**12.30** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**13.00** Пернікавы домік. «Саладкая праца».
**13.30** Ігар Касталеўскі, Міхаіл Філіпаў, Святлана Немаляева, Галіна Анісімава ў спектаклі тэатра імя Ул. Маякоўскага «Плады асветы».
**16.15** «Гульня ў бісер». «Паэзія Сашы Чорнага».
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** «Рамантыка рамансa».
**18.30, 2.40** Сусветныя скарбы.
**18.50** 80 гадоў Леаніду Кураўлёву. «Астравы».
**19.25** «Ваш сын і брат». Маст. фільм.
**21.00** Вялікая опера—2016.
**23.00** «Белая студыя».
**23.40** Кіно на ўсе часы. «Такі прыгожы маленькі пляж». Маст. фільм.
**1.20** «Сландайк». «Сландайк 2». М/ф для дарослых.
**1.55** «Шукальнікі». «Жалезны кароль Расіі».

### Настальгія

**6.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**7.00** Маст. фільм «Дрэнны добры чалавек».
**8.35** Спявае ВІА «Синяя птица». 1979 год.
**9.00, 3.00** «Мінулы час».
**9.40, 13.35, 17.25, 18.50, 20.40, 23.35, 1.00, 2.45, 3.40** Музычная настальгія.
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.05** Фільм-канцэрт Марылі Радовіч «Фатаграфія ў ліпені». 1987 год.
**12.00** Маст. фільм «Чужая радня».
**14.00** Дак. фільм «Навіны дня. Хроніка нашых дзён».
**14.10, 16.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1957. 2009 год.
**15.00** «Колба часу». «1957 год».
**19.55** «Тэма» з У. Лісцьевым. «Легалізацыя, нашэнне і захоўванне зброі». 1992 год.
**21.00** «Быў час». 2008 год.
**22.00** Тэлеспектакль «Таблетку пад язык». 1978 год.
**0.00** «Сняем, сябры!» з Наталляй Казялковай. Тэма: «Творчасць Булата Акуджавы». 2004 год.
**1.25** Тэлеспектакль «Ліка». 1978 год.
**5.00** «Песня-79». 1-е аддзяленне.

### EuroSport 1

**4.00, 5.30, 9.30, 16.00, 23.00, 0.30** Футбол. Чэмпіянат свету сярод дзяўчат (U-17).
**6.30, 11.30, 22.00, 1.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21.
**8.00, 13.00, 18.00, 2.30** Снукер. European Masters.
**0.00** Ралі ERC.

### Кінакамедыя

**0.35** Камедыя «Лілі Давід».
**2.15** Камедыя «Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі».
**4.10** Скетчкам «Паміж намі».
**05.05** Камедыя «Тупы і яшчэ тупейшы 2».
**7.00** Камедыя «Шалёныя выкладчыкі».
**8.35** Камедыя «Гіганцік».
**10.20** Меладрама «(Не)чаканы прынц».
**11.55** Меладрама «Двое — гэта занадта».
**14.00** Камедыя «Дзеці сексу не перашкода».
**16.00** Камедыя «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях».
**18.05** Мюзікл «Прагулка па сонечнаму святлу».
**19.50** Камедыя «Закусачная на колах».
**21.45** Камедыя «Няўдачлівыя».
**23.20** Камедыя «Я вяртаюся да мамы».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.00** «Хронікі маскоўскага побыту».
**10.55** «Доказ віны».
**11.30, 1.15** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**15.05** «Робаты». Анімацыйны фільм.
**16.30** «Зоркі. Тайны. Лёсы».
**17.30, 4.15** «Алігарх ТБ».
**18.00** «Вакол свету. Месцы сілы».
**19.00** «Грэх». Драма.
**21.00** «Хуткасць 2». Баявік.



**23.15** «Каліфрэнія». Серыял.
**23.45** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.40** «Знайсці згубленага». Дак. фільм.

### ТБ1000

**6.10, 17.50** Прыгоды «Каратэ-хлапчук».
**8.30** Фантастыка «Жонка падарожніка ў часе».
**10.20** Драма «Доўгія заручыны».
**12.35** Камедыя «Выдатніца лёгкіх паводзін».
**14.10** Драма «Джо».
**16.10** Камедыя «Прасцячка».
**20.10** Меладрама «Тры метры над узроўнем неба».
**22.20** Трылер «Выжывуць толькі палюбоўнікі».
**0.30** Трылер «Перш чым я засну».
**2.10** Драма «Монстр».
**4.25** Камедыя «Прасцячка».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Меладрама «Будзь са мной».
**7.35** Драма «Жыць».
**9.10** Дэтэктыў «Хто я?»
**10.50** Камедыя «Любовь-морковь».
**12.35** Старое добрае кіно. Камедыя «Цырк».
**14.25** Меладрама «Восьмае сакавіка».
**16.15** Драма «Гарпастум».
**18.35** Камедыя «Вайна полаў».
**20.20** Камедыя «Мужчына з гарантыяй».
**22.10** Камедыя «Выкрутасы».
**0.10** Трагікамедыя «Піянеры-героі».
**2.10** Драма «Белая белая ноч».
**4.35** Меладрама «КосцяНіка. Час лета».

### National Geographic

**6.00, 12.40** Навука будучыні.
**6.50** Як перамагчы ва ўсім.
**7.10, 13.30, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00** Незвычайныя промыслы.
**10.20** Дзікі тунец.
**11.10** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**11.55, 23.20, 3.10** Расследаванні авіякатастроф.
**14.10** Прарыў.
**21.00, 0.50, 4.00** Расійскія сакрэтныя матэрыялы.
**21.45, 1.40, 4.50** Карставыя варонкі.
**22.30, 2.40** Крытычная сітуацыя.
**0.05** Паранармальнае.

### Discovery

**8.00** Загадкі планеты Зямля.
**9.00** Стальныя хлопцы.
**10.00** Металаломшчыкі.
**11.00, 23.00** Востраў.
**12.00** Выжыць разам.
**13.00, 1.00** Голыя і напалоханыя.
**14.00** Аляска: сям'я з лесу.
**15.00** Заваяванне новых зямель.
**16.00** Як працуюць машыны.
**17.00** Будаўнікі караблёў-гігантаў.
**18.00, 7.10** Махінатары.
**19.00, 0.00** Мяцежны гараж.
**20.00** Вулічныя гонкі.
**21.00** Як працуюць машыны.
**22.00** Харлі і Дэвідсан.
**2.00** Гульня на жыццё.
**4.40** Аўтальянцы.

## А вы ведалі?

## ЧЫТАЦЬ — НЕ ПЕРАЧЫТАЦЬ

**У сучасным цывілізаваным свеце чытаць умее амаль кожны, а вось пра некаторыя асаблівасці чытання ведае мала хто. Вашай увазе — крыху цікавых фактаў з даследаванняў вучоных розных краін пра кнігі і тых, хто іх піша і чытае.**



Калі чытаеш пра пазяханне, сам пачынаеш пазяхаць.

*У мінулым кнігі ставіліся на паліцу «наадварот»: карашком да сцяны і пярэднім абрэзам вонкі.*

Даследаванні паказваюць, што 4—6 гадоў — самы спрыяльны ўзрост для навучання дзіцяці чытанню. Пасля 6—7 гадоў навучыць чытаць больш складана.

*У сярэднім людзі праводзяць за чытаннем 6,5 гадзіны штотыдзень.*

Паводле даследавання Ельскага ўніверсітэта, тры чвэрці вучняў, якія дрэнна ўмеюць чытаць у трэцім класе, застануцца такімі ў сярэдняй школе.

*На напісанне рамана сыходзіць у сярэднім каля 475 гадзін.*

Сярод кніг, якія былі напісаны ці задуманы за кратамі, — «Дон Кіхот» Мігеля дэ Сервантэса, «Падарожжа пілігрыма» Джона Баньяна, «Турэмная споведзь» Оскара Уайльда, «Гасудар» Нікало Макіявелі.

*Раней у бібліятэках кнігі прыкоўвалі да паліц ланцугамі.*

У сярэднім пакупнік кнігарні праводзіць 8 секунд, гледзячы на пярэднюю вокладку кнігі, і 15 секунд, праглядаючы заднюю.

*Палову ўсіх прадаваных сёння кніг купляюць людзі, старэйшыя за 45 гадоў.*

Дарослыя, якія рэгулярна чытаюць літаратуру, больш чым у два з паловай разы схільныя займацца добраахвотніцкай або дабрачыннай працай і больш чым у паўтара раза схільныя прымаць удзел у спартыўных мерапрыемствах.

*Жанчыны купляюць 68% усіх кніг.*

Большасць чытачоў губляюць цікавасць да кнігі на 18 старонцы.

*Самы доўгі марафон каманднага чытання ўслых прадоўжыўся 224 гадзіны і быў завершаны Мільтанам Нэнам, Сільвінай Карбоне, Карласам Антонам, Эдзіт Дыяз, Іяланду Баптысту і Наталі Дантаз у гандлёвым цэнтры «Мас» у Пайсанду, Уругвай, 13—22 верасня 2007 года.*

Кнігі ў мяккай вокладцы выдавецтва «Penguin» былі створаны для таго, каб зрабіць кнігі такімі ж даступнымі, як цыгарэты, а першыя «пінгвінаўскія» кніжкі ў мяккай вокладцы распаўсюджваліся ў цацкаве.

*Лічыцца, што малапісьменнасць штогод абыходзіцца бізнесу і падаткаплацельшчыкам у 20 мільярдаў долараў у выглядзе страчанай заработнай платы, упушчанага прыбытку і зніжанай прадукцыйнасці.*

Бібліяклептаманам называюць чалавека, які крадзе кнігі. Адзін з самых вядомых бібліяклептаманаў — Стывен Блумберг, які ўкраў больш за 23 000 рэдкіх кніг з 268 бібліятэк. Каб скласці сваю калекцыю, якая ацэньваецца прыкладна ў 20 мільёнаў долараў, Блумберг выкарыстоўваў самыя разнастайныя метады: часам ён прабіраўся ў бібліятэку праз вентыляцыйную сістэму і нават шахту ліфта.

*Тэрмін «кніжны чарвяк» паходзіць ад маленькіх насякомых, якія харчуюцца карашкамі кніг*




## ДУРНЫЯ ЖАРТЫ ПАХВАЛЫ НЕ ВАРТЫ

У вёсцы без уласнага транспарту як без рук, бо яно ж то ўчастку под бульбу дадуць немаведама дзе, то сенакос кіламетраў за пяць. Напрацуешся там, зморышся, а потым жа трэба і дамоў дапаўзці... Альбо адтуль у краму пад'ехаць ці ў лес — па ягады, па грыбы. Іх, як вядома, збіраць адно задавальненне, а вось потым несці — ужо іншае: часам аж рукі адрываюцца. І таму...

У сямідзясятыя гады беднейшыя з нашых вяскоўцаў куплялі сабе веласіпеды, багацейшыя — матацыклы («Іжы», «Уралы»), а багатыя — дык нават з каляскамі.

Што здзіўляла, не меў вось такога стальнога каня хіба што Адамавіч. З ім пра матацыклы нават гаворку ніхто не вёў, хоць ведалі, што грошы ў чалавека ёсць. Тады чаму?

Аднойчы, па п'янцы, ён сам расказаў, адкуль яго нелюбоў.

...Значыць, пасля службы ў арміі падаўся ён у міліцыю, участковым стаў. Вёсак шмат, участак вялікі, а транспарту спачатку аніякага: дабірайся дзе пехам, дзе на чым спадарожным...

Дык вось. Выклікалі яго неяк да начальства ў райцэнтр. Ідзе, чуе — ззаду матацыкл лапоча. Азірнуўся, стаў. І матацыкл спыняецца: сядай, маўляў, ківае кіроўца. Адамавіч ззаду прымасціўся, едзе, прыкідвае, праз колькі хвілін можа на месцы быць... Хоць пры гэтым, вядома ж, адчувае, што з матацыклістам нешта не так: ён то ляціць, як на злом галавы, то раптам запавольваецца.

Пасажыр адпаведна таксама: то ад страху аж вочы заплюшчыць (і зубы сашчэпіць, бо дарога брукаваная), то з палёгкай уздыхне: «Можа, і даедзем?»

Не паспеў падумаць, — матацыкл як зараве! Газ, трэба разумець, на ўсю катушку, а кіроўца пры гэтым... рукі ўверх і крычыць: «Э-эй, давай закурым. Ты будзеш?» І адной рукой яму цыгарэты падае, а другой запальнічку.

«Усё, гэта капут!» — думае ні жывы ні мёртвы Адамавіч.

...Але ж да райцэнтра яны неяк даехалі. Сталі там. Пасажыр хацеў бы злезці, але ногі не трымалі яго. Так і сеў пры дарозе.

Потым даведаўся. што той матацыкліст не проста прафесійны гоншчык, а яшчэ і цыркач. Пад купалам свае трукі паказваў, людзей забаўляў. Відаць, падабалася, бо справу гэтую кінуць не мог — нават пасля таго, як звольніўся.

**Любоў Чыгрынава,**
*г. Мінск.*

## РУЖЫ З СЮРПРЫЗАМ

«Ох ужо гэтае свята! І хто яго толькі выдумаў на нашы галовы!» — стагналі мужыкі ў пачатку сакавіка. І апроч таго, вядома ж, раіліся з сябрамі, бегалі па крамах — шукалі падарункі для сваіх жанчын. А ўжо кветкі — гэта і пагатоў!

Мой знаёмец Іван Пятровіч загадзя прыглядаўся да ружаў, думаў, якія ж сёлета выбраць — чырвоныя ці ружовыя? Можа, белыя, ці вунь тыя пярэстыя — не скажаш, якога і колеру... У краме чаго толькі няма...

Але ж выбар нарэшце спыніўся, прычым на адной вельмі незвычайнай галінцы. На ёй было цэлых пяць чырвоных кветачак, а каштавалі яны як асобныя дзве!

Пашанцавала, карацей, чалавеку, і ён папрасіў загарнуць...

Пасля гэтага заставалася неяк давезці той пяшчотны скарб дадому і назаўтра зрабіць сюрпрыз.

Для гэтага вечарам 7-га сакавіка Іван Пятровіч доўга сядзеў каля тэлевізара: чакаў, пакуль жонка ўсё паробіць, потым — пакуль засне. Пераканаўшыся, што спіць, і ўжо моцна, гаспадар прынёс з балкона пакунак, вызваліў ружы з папяровай абгорткі і асцярожна «ўтапіў» у ванне, каб, крый божа, не завялі, каб раніцай свежанькімі іх уручыць. Падумаў яшчэ, што сцяблінка трохі задоўгая — добра было б падрэзаць, але ж і гэта ён пакінуў на заўтра.

Будзільнік празвінеў рана. Іван Пятровіч тут жа падхапіўся з пасцелі, ціхенька прывёў сябе ў парадак і выняў з вады чароўную галінку. З ёю і падарункам ён падаўся да жонкі ў спальню, асцярожна ўключыў начнік і, прысеўшы на ложак, сказаў:

— Добрай раніцы, любая! Са святам цябе!

Тая расплюшчыла вочы, убачыла кветкі і...

Не, ён не дарэмна стараўся: жонка і сапраўды ахнула, сказала:

— Божухна, якая прыгажосць!..

Праўда, потым і, трэба разумець, знячэўку з яе вуснаў сарвалася:

— Але чамусьці не пахне?.. Трэба ў ваду, — тут жа паправілася яна. — Прынясі з залы вазу. І сцяблінку падрэж.

— Ну вядома ж, — згадзіўся Іван Пятровіч і рушыў у кухню.

Узяў там нож, уключыў халодную ваду. Навучаны, паспрабаваў пад струменем адрэзаць. Нічога падобнага, — гэты нож сцяблінку «не бярэ». «Што за ліха?» — падумаў гаспадар, дастаў большы нож, днушку — стаў рэзаць з сілай. Марна! «Хацеў бы я на куст паглядзець, дзе такія кветкі растуць», — пачухаў патыліцу гаспадар: узяўся мацаць лісты (у кухню як на тое ліха ўвайшла жонка) і... усё зразумеў.

— Яны не жывыя, — прызнаўся гаспадар, сам ледзь жывы ад гэтай здагадкі. — Прабач! Але ж гэта галінка мне так спадабалася...

— І мне яна падабаецца! — з разуменнем усміхнулася жонка. — Ну сапраўды — прыгожыя ж! А галоўнае — гэтыя ружы ніколі не звянуць...

— Як наша любоў, — з надзеяй прамовіў Іван Пятровіч.

**Раіса Васільева,**
*г. Гомель*

## З ЛЕСУ МОГ ВЫЙСЦІ ТОЛЬКІ МЯДЗВЕДЗЬ

...У той год мне пашчасціла адправіцца ў круіз па маршруце Краснаярск — Дыксан — Краснаярск. І адразу скажу: гэта падарожжа — за Палярны круг, да льдоў Арктыкі, да Карскага мора, куды нясе свае воды магутны Енісей, было выключна цікавым! Арктычныя астравы, айсбергі, тундра, тайга...

Але ж, як той казаў, далей болей: нам, турыстам, мала было палюбавацца ўсім з цеплахода, — мы захацелі прайсціся па той зямлі, прыгледзецца, адчуць яе сілу.

Карацей, упрасілі мы капітана: прыпыніў ён цеплаход, прычым не каля нейкага там паселішча, а ў проста рэдкасна́й глухамані! Мы ўсе былі ад яе пад уражаннем, бо там, на беразе ўзвышаліся магутныя кедры, сосны, елкі. Падымеш галаву — неба не відаць, суцэльныя кроны, потым апусціш — не паверыце — не бачна і... зямлі. Бо вакол проста жудасны бурелом: паваленыя дрэвы, ламачча... Па ім не тое што ісці, нагу паставіць немагчыма!

Іншымі словамі, такой — з дазволу — магутнай беспрасветнасці я не бачыў ніколі і нідзе, хоць, паверце, падарожнічаў вельмі шмат.

А таму і досвед меў: калі сказалі, што ад'язджаем альбо адплываем у 17.00, значыць, у аўтобусе ці на цеплаходзе можна апынуцца трохі раней, але пазней — ні ў якім разе!

У нас, як спачатку здалося, гэта ведалі ўсе, і таму ў прызначаны час судна адчаліла ад берага, мы ціха-мірна паплылі далей... Але ж (праз некалькі гадзін!) загаварыла наша карабельная радыё: дзвюх турыстак запрашалі ў кают-кампанію. «З чаго б гэта? — падумалі мы і забыліся б, калі б аб'ява не прагучала яшчэ раз, а потым яшчэ. Маланкай пранеслася чутка, што гэтыя дзве жанчыны згубіліся...

Падобная сітуацыя была падчас майго падарожжа па Волзе. Адна дзяўчына, калі цеплаход ужо адпраўляўся, купацца пайшла і, вядома ж, адстала...

Ніхто яе тады не чакаў і не шукаў...

Але ж там і чыгунка, і водны транспарт: яна мела магчымасць дагнаць нас у наступным вялікім горадзе, што і зрабіла... Ва ўсякім разе, ніякая небяспека ёй не пагражала. А вось тут...

Тут, па-першае, быў сапраўдны таёжны тупік з усёй яго непрадказальнасцю, па-другое, пол (слабы... жанчыны ж!), па-трэцяе — на ноч гледзячы, у лёгкім адзенні...

Карацей, пакінуць іх у бядзе мы не маглі: мусілі развярнуцца і паплыць назад.

...Не ведаю, што за гэты час перажылі нашы «рабінзонкі», але ж, дзякаваць богу, у адчаі рукі не склалі і розум не страцілі. Для таго, каб на беразе іх можна было заўважыць, падабралі высокую жэрдку і, што называецца, выкінулі сцяг.

З чаго яго можна было зрабіць? А з чаго мелі: з камбінацый, з ніжніх сваіх сарочак. Менавіта імі жанчыны планавалі сігналізаваць любому транспартнаму судну, якое будзе праплываць паўз іх па Енісеі. А паколькі за штурваламі, як правіла, мужчыны, шанц на выратаванне ў іх быў. Хоць, вядома, і мізэрны, бо чакаць дапамогі з сушы ім ніяк не выпадала: адтуль мог выйсці толькі мядзведзь.

...На нашым цеплаходзе навакўленых рабінзонак прымалі досыць сурова. У іх адрас і экіпаж, і турысты выказалі шмат нядобрых слоў — папракалі (і справядліва!) у легкадумнасці, у бесклапотнасці, пагражалі сур'ёзным штрафам...

Але ж і для іх, і для многіх іншых гэта гісторыя запомнілася найперш... урокам, што ўвачавідкі паказаў, у якія без перабольшвання страшныя перапляты можна патрапіць, як нашкодзіць самому сабе, калі дзейнічаць безадказна. Асабліва — у дарозе. І далёка ад дома.

**Пётр Сачыўка,**
*в. Цырын, Карэліцкі раён.*

**Рубрыку вядзе**
**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

## Прызнанне

# ЗНАХОДЗІЛІ, АХОЎВАЛІ, ПАПЯРЭДЖВАЛІ...

**Верасень выдаўся вельмі ўраджайным на падзякі ад насельніцтва для супрацоўнікаў міліцыі Магілёўскай вобласці.**

«Дзякую ўсім за тое, што мяне, грамадзянку замежнай дзяржавы, не пакінулі ў бядзе і дапамаглі, праявіўшы найлепшае чалавечае стаўленне», — напісала ў электронным лісце ў МУС Беларусі грамадзянка Украіны. Такім чынам яна аддзячыла супрацоўнікам аддзялення ДАІ Шклоўскага РАУС на чале з маёрам міліцыі Віктарам Дашкевічам «за прафесіяналізм, высокія арганізацыйныя здольнасці і асабістыя маральныя якасці». Размова ідзе пра дарожна-транспартнае здарэнне ў Шклоўскім раёне, якое адбылося жнівеньскім вечарам на аўтадарозе «Віцебск—Гомель» непадалёк ад вёскі Заходы. Кіроўца грузавіка «DAF» не справіўся з кіраваннем, яго машына з'ехала ў кювет, а сам мужчына загінуў. «Шклоўскія супрацоўнікі міліцыі высветлілі, што грузавік з вельмі дарагімі камплектуючымі для ліфтавага абсталявання ішоў транзітам з Санкт-Пецярбурга ў Кіеў. Начальнік аддзялення Віктар Дашкевіч асабіста звязаўся з уласнікам грузу, каб папярэдзіць аб здарэнні. Акрамя гэтага, была арганізавана ахова каштоўнага грузу ад марадзёрства і прадстаўлена тэхніка, каб выцягнуць фуру з кювета», — расказала **спецыяліст аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Магілёўскага аблвыканкама Юлія ХАЛАМЕЕВА.** Гаспадыня каштоўнага грузу і напісала падзяку шклоўскім міліцыянерам.

Зоя Старавойтава з Хоцімска выказала вялікую ўдзячнасць следча-аператыўнай групе мясцовага РАУС на чале з намеснікам начальніка па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні капітанам міліцыі Аляксандрам Малюгай за аператыўную дапамогу ў пошуку зніклых цялят.

Двойчы вызначаліся міліцыянеры з Клічава. Чатыры дні яны разам з ратавальнікамі і супрацоўнікамі лясгаса шукалі ў лесе 80-гадовую жанчыну, якая пайшла па грыбы і не вярнулася дадому. Бабулю знайшоў начальнік аддзялення крымінальнага вышуку РАУС маёр міліцыі Аляксандр Дарошка. Сын пенсіянеркі адрасаваў падзяку ўсім міліцыянерам, якія шукалі яго маці, і асобна Аляксандру. Жанчына, дарэчы, адчувае сябе добра, нягледзячы на тое, што некалькі дзён правяла пад адкрытым небам. А начальнік ІСН Клічаўскага РАУС маёр міліцыі Алена Сырамалот і яе падначалены старшы лейтэнант міліцыі Дзмітрый Купцоў атрымалі падзяку за тое, што праявілі пільнасць у адносінах да двух дзевяцігадовых хлопчыкаў, якія каталіся на дарагім веласіпедзе «Стэлс». Алена дакладна ведала, што такога веласіпеда ў хлопцаў не было. Як высветлілася, падлеткі скралі яго з гаража аднаго з мясцовых жыхароў. «Веласіпед вярнуўся да гаспадара яшчэ да таго, як ён даведаўся аб знікненні», — удакладніў начальнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязей УУС Магілёўскага аблвыканкама Дзмітрый Ігнатовіч.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## Неасабісты суб'ектыў

# ВЫШЭЙШАЯ КАТЭГОРЫЯ

### Пра непадораныя кветкі і не толькі



ВЫХАДНЫЯ на самым пачатку кастрычніка заўсёды, з самага дзяцінства, прасякнутыя нейкай сціплай урачыстасцю. І абавязкова прысутнасцю вялікай колькасці кветак. Стракатыя калматыя астры, жоўта-аранжавыя аксамікі з вясковых клумбаў, позні гладыёлусы... На Дзень настаўніка яны кожны год займалі ўжо не толькі ўсе вазы, але і трохлітровыя слоікі — у суботу мама заўжды прыносіла са школы «вязанку кветак», як жартавалі ў нас дома. Сярод іх, колькі памятаю, ніколі не было куплёных — ружаў, гваздзікоў ці модных сёння архідэй ды гіяцынтаў. Але яны былі самыя што ні ёсць сапраўдныя — гэткія восеньскія сігнальныя ліхтарыкі людской удзячнасці і павагі.

Сёння — ведаю не па чутках — кветак настаўнікам на прафесійнае свята дораць значна менш. Нават у вёсцы, дзе па-ранейшаму ўвосень раскашуюць на клумбах (абсалютна бясплатна!) астры, аксамікі і позні гладыёлусы, а побач з імі навамодныя ружы, хрызантэмы ды іншыя заморскія дзівосы, якімі гаспадыні засаджваюць свае гародчыкі. Мала хто цяпер спяшаецца зрэзаць самую прыгожую і даць у руку дзіцяці са словамі «Занясі, павіншуй настаўніцу». І адбываецца так, думаю, зусім не ад скваннасці. Справа менавіта ва ўдзячнасці і павазе. Якіх у адносінах да настаўніка ў людской свядомасці, я ўпэўнена, менш не стала. Але праяўляць якія стала не патрэбна і... не модна, ці што?..

Канешне, просты настаўнік — не тэлезорка, не выдатны грамадскі дзеяч і нават не мясцовае начальства. Небарака, якому заўжды не хапае сродкаў на пражыццё, які завалены па самую макаўку непатрэбнымі паперамі, справаздачамі і заданнямі. І толькі пасля з-пад гэтага друзу з цяжкасцю прабіваецца сейбіт «разумнага, добрага, вечнага»... Выбачайце, шаноўныя педагогі, але нярэдка ваш вобраз малюецца сёння ў свядомасці людзей менавіта так. Пытанні аб прэстыжы прафесіі настаўніка, аб зарплаце, аб адпаведнасці загрузкі падымаюцца сёння на самым высокім узроўні, пакрысе пачынаюць вырашацца. І, дасць бог, вырашацца ў самым аптымістычным варыянце. Толькі мне здаецца, тут не ў адных грашах, колькасці гадзін у стаўцы справа. Дакладней, зусім не ў іх.

КАЛІ казаць шчыра, прафесія настаўніка ніколі асабліва высокааплатнай не была. Мая мама, як і яе калегі, яшчэ за савецкім часам атрымлівалі значна менш, чым, напрыклад, даярка на мясцовай ферме. Але гэта не прыніжала, не прымушала хадзіць, угнуўшы плечы ад цяжару жыцця. Усведамленне (не спушчанае «зверху», а менавіта асабістае) уласнага сацыяльнага статусу, актыўная жыццёвая пазіцыя рабілі тое, чаго не здольныя зрабіць ні каштоўныя ўпрыгожанні, ні дарагая вопратка. Тады яшчэ не прыдумалі дзялення на катэгорыі, і ў іх усіх была адна катэгорыя — вышэйшая. Не прайсці раўнадушна міма пяцікласнікаў, якія спрабуюць зацягвацца цыгарэтай, добра прапясочыць нецвярозага аднавяскоўца, які ганяе жонку і малых дзяцей, праведаць вучня, які тры дні не з'явіўся ў школу, — нашы настаўнікі рабілі гэта, кіруючыся не нейкімі там дырэктыўнымі рэкамендацыямі, а прафесійным... не, не абавязкам, хутчэй — сумленнем. На педсаветах яны спрачаліся, адстойвалі, калі трэба, сваю думку і сваіх вучняў перад кіраўніцтвам няхай сабе і з раёна. (Здаралася раней, і нярэдка, што толькі дзякуючы цвёрдай пазіцыі настаўніцы не адлічвалі са школы якога хлопца з сям'і калгаснікаў за тое, што прагульваў заняткі. А прагульваў таму, што працаваў на ферме за бацьку, які пайшоў у чарговы запой.) Да праверак, якіх, дарэчы, было не менш, чым цяпер (адны «адкрытыя ўрокі» раённага маштабу чаго вартыя былі!), ставіліся адказна, але без фанатызму і без гэтага трагікамічна-панічнага гвалту «Барына везут!» Ведалі сабе цану, вучылі дзяцей праграме сярэдняй школы і быць прыстойнымі, сумленнымі людзьмі.

І на Дзень настаўніка ім прыносілі букеты нават самыя заўзятыя двоечнікі. А дзядзька, якому застаецца два гады да пенсіі, ідучы нападпітку, пры сустрэчы са сваёй зусім ужо старэнькай першай настаўніцай і сёння сарамліва апускае вочы і мармыча: «Ну, атрымалася так, Еўдакімаўна, але ж я нічога, я вось дадому іду...»

НА гэтым тыдні намеснік міністра адукацыі зноў сур'ёзна гаварыў пра павышэнне зарплаты педагогам. Абмяркоўваюцца варыянты гэтага павышэння, працуюць над гэтым прадстаўнікі розных ведамстваў. Даручэнне кіраўніка дзяржавы будзе выканана, запэўніў чыноўнік.

Зарплаты павысяцца, з нагрузкай, думаю, таксама разбяруцца. Самім жа настаўнікам застанецца толькі адно — пацвердзіць сваю вышэйшую катэгорыю.

Гэта я не пра ўрокі, калі хто не зразумеў.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БПХО»

## с понижением начальной цены продажи на 40 процентов

| № п/п | Наименование лота | Местонахождение | Начальная цена продажи, с учетом НДС, руб. коп. | Задаток 20%, руб. коп. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | **Лот № 14 – капитальные строения:** | | | |
| 1.1 | Хозяйственный корпус ЖКУ с инвентарным номером 110/С-102445, площадью 850,0 кв.м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 4А, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000798, площадью 0,7228 га | **198 920,88** | **39 784,18** |
| 1.2 | Уличное освещение ЖКУ с инвентарным номером 110/С-111919, протяженностью 333,6 м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 4А, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000798, площадью 0,7228 га | **1526,98** | **305,40** |
| 1.3 | Канализационная сеть здания ЖКУ с инвентарным номером 110/С-111736, протяженностью 61,1 м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 4А, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000798, площадью 0,7228 га | **154,66** | **30,93** |
| 1.4 | Водопроводная сеть здания ЖКУ с инвентарным номером 110/С-111735, протяженностью 50,0 м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 4А, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000798, площадью 0,7228 га | **91,44** | **30,48** |
| 1.5 | Теплотрасса здания ЖКУ с инвентарным номером 110/С-111734, протяженностью 38,0 м | Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 4А, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000798, площадью 0,7228 га | **755,86** | **151,17** |
| | **Итого:** | | **201 449,82** | **40 289,96** |

**Аукцион состоится 31 октября 2016 в 14.00 по адресу: 225410, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 503, 5 этаж.**

**Организатор аукциона:** открытое акционерное общество «Барановичское производственное хлопчатобумажное объединение» (ОАО «БПХО»), г. Барановичи, ул. Фабричная, 7.

Заявления и документы на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 602. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **25.10.2016**.

Задаток вносится до подачи заявления на участие в аукционе на р/с 3012605450052 в отделении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 150501245, получатель платежа – ОАО «БПХО», УНП 200166488.

Шаг торгов – 5 процентов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня подписания (утверждения) протокола о проведении аукциона. Сроки оплаты за предмет аукциона устанавливаются при заключении договора купли-продажи с продавцом.

Победитель (единственный участник) аукциона в течение 3 рабочих дней после дня проведения аукциона (утверждения протокола) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии с Соглашением.

Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона: **(80163): 47-63-80, 47-63-50, 47-65-17.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЙ РУП «БРЕСТСКОЕ ОТДЕЛЕНИЕ БЕЛОРУССКОЙ ЖЕЛЕЗНОЙ ДОРОГИ»

| № лота | 1 |
|---|---|
| **Наименование, местонахождение и характеристика объекта** | Право заключения договора аренды капитального строения с инвентарным № 100/С-22409 (**гараж для автомашин с бытовыми помещениями**), площадью 624,7 кв.м и составных частей: асфальтобетонное покрытие (2320 кв.м), ограждение (183 м), ограждение (91 м), ворота металлические (1 шт.), ворота металлические (1 шт.), расположенного по адресу: г. Брест, ул. Лейтенанта Рябцева, д. 27В, *для авторемонтных услуг*. Характеристика: в здании имеются отопление, канализация, водоснабжение, электроснабжение, объект представляет собой двухэтажное здание |
| **Балансодержатель** | «Брестгрузтранслогистик» – филиал РУП «Брестское отделение Белорусской железной дороги» |
| **Начальная цена продажи** | **2 123 руб. 98 коп. (BYN)** |
| **Сумма задатка** | 212 руб. (BYN) |
| **Срок аренды** | **3 года** |
| **Сумма арендной платы в месяц** | **187,41** базовой арендной величины (капитальное строение);<br>**116,0** базовой арендной величины (асфальтобетонное покрытие 2320 кв.м);<br>**18,3** базовой арендной величины (ограждение 183 м);<br>**9,1** базовой арендной величины (ограждение 91 м);<br>**2,0** базовой арендной величины (ворота);<br>**2,0** базовой арендной величины (ворота) |
| **Условия оплаты** | разовый платеж |
| **Размер штрафа** | 2 100 руб. (BYN) |
| **Условия продажи** | **заключение договора аренды оборудования (подъемник ПД-3, водонагреватель, окрасочно-сушильная камера, подъемник, охранно-пожарная сигнализация)** |
| **Организатор аукционных торгов** | **КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью», г. Брест, ул. Ленина, 50. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. www.bgcn.by** |

ПРИМЕЧАНИЕ:

Для участия в аукционе юридических или физических лиц, в том числе индивидуальных предпринимателей, прилагаются к заявлению, подаваемому:

1. юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь: копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

2. юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

3. индивидуальным предпринимателем: копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя; копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

4. физическим лицом – копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.

При заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются: представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

***Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Брест, ул. Московская, 202, код банка 246, УНП 290433924.***

Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. №1049.

Право заключения договора аренды возникает у победителя аукциона с момента внесения им определенной в ходе аукционных торгов цены за право аренды нежилого помещения. Данная сумма должна быть внесена победителем в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор аренды должен быть подписан в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**Победитель аукциона обязан оплатить организатору аукциона в течение 3 рабочих дней с даты проведения торгов** сумму в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

**Аукцион состоится 1 ноября 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 30.09.2016 г. до 17.30 26.10.2016 г.**
**(перерыв с 13.00 до 14.00; выходной день: сб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**
**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by, www.brest-region.gov.by, www.gki.gov.by**

**РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 31 октября 2016 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже объекта недвижимости – здания склада запасных частей, расположенного по адресу: Гомельская обл., Брагинский р-н, г.п. Комарин, ул. Ленина В.И., 20В, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Брагинагросервис» на праве собственности**

| № лота | Наименование объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, руб. (в т.ч. НДС по ставке 20%) | Задаток, руб. (в т.ч. НДС по ставке 20%) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание склада запасных частей, **инв. №343/С-67904** | Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Одноэтажное кирпичное строение, 1962 года постройки. Общая площадь 404,8 м кв. Составные части и принадлежности: пристройка | **36 240,00** *(Справочно: начальная цена без учета деноминации 362 400 000 бел. рублей)* | **1 000,00** *(Справочно: сумма задатка без учета деноминации 10 000 000 бел. рублей)* |
| | ***Земельный участок** для обслуживания здания на праве постоянного пользования площадью **0,0604 га** с кадастровым номером 320355700001000320. **Имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки: расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, площадь 0,0604 га; расположенные на территориях, подвергшихся радиоактивному загрязнению, площадь 0,0604 га.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь* | | | |

Шаг аукциона – 15%. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 28 октября 2016 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 9.00 до 10.00 **31 октября 2016 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5%.

